Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтр... Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гада.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу іншагародняя — 20 к. масцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтэ пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпальтэ пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок шпальтэ перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зьніжэньне тэрміну бярэцца 10 проц. ад тэксту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесплатныя і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх дзярж.-тэл. аўтасувязі. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-й дом Саветаў).

10 год выд... — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 246 (2735) Субота, 26-га кастрычніка 1929 г.

ПАВЯЛІЧЫЦЬ СУМУ 3-Й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Падтрымаем патрабаваньні рабочых аб дадатковым выпуску 3-й пазыкі. Пры выкананьні БССР 134 проц. заданьня вёска выканала толькі палову свайго заданьня.—Прасунем пазыку ў вёску.

ТРЭБА ПРАЦЯГВАЦЬ КАМПАНІЮ.

Ідэяя пазыка індустрыялізацыі рэалізавана поўнасьцю, нават са значным перавышэньнем. Пазыка была ...шчана на 750 міл. рублёў, зараз ...па ўсяму Саюзу падпіска на падасягнула 765 міл. рублёў. У ...торых-жа мясцох перавышэньне ...іскі дае значныя паказьнікі. Па ...СР III пазыкі індустрыялізацыі ...распаўсюджана 15.122.000 ...блёў, што складае 134,4 проц. ...тапачатковага заданьня.

...кі посьпех у распаўсюджваньні ...пазыкі індустрыялізацыі гаво..., аб вялікай сьвядомасьці пралетарскіх мас нашага Саюзу, гаворыць ...нтузіязьме пралетарыяту, гаворыць ...каданьні іх дапамагчы разгортанню сацыялістычна будаўніцтва. ...я посьпехі і той водгук, з якім ...спаткана апошняя пазыка зьяўляцца лепшаю сьведкаю таго, што ...чая кляса нашай краіны дружна ...трымлівае палітыку партыі і праўраду аб разгортваньні індустрыялізацыі, ...шырэньні сацыялістычнага будаўніцтва. Усё гэта зьяўляецца лепшым адказам праваўхілісцкім ныццікам, ...яшчэ і дагэтуль ня ўпоўніліся ў ...зільнасьці генэральнай лініі партыі ня ўдаўніліся ў магутным ...це сацыялістычнага будаўніцтва, ...праводзіцца рабочымі і бяднейшымі сялянамі пад кіраўніцтвам ...КП(б).

Рабочая кляса ня толькі выканала свой сацыялістычны абавязак перад дзяржавай, але і апярэдзіла нашыя першапачатковыя меркаваньні. Усё больш і больш узрастаючы тэмп нашага будаўніцтва стаў зразумелым для ўсяе рабочае клясы. Зразумелым стала і тое, што такі тэмп будаўніцтва патрабуе ўкладаньня новых сродкаў. Таму рабочыя пралетарскіх аспродзьдзяў, як Масквы і Ленінграду, высунулі пытаньне аб павялічэньні кантрольных лічбаў пазыкі, аб новых укладаньнях у сацыялістычнае будаўніцтва.

Рабочыя заводу «Дынамо» ў Маскве і рабочыя Балтыцкага заводу ў Ленінградзе выказаліся за павялічэньне III пазыкі індустрыялізацыі да аднаго мільярду. Гэтая думка ўжо падхоплена рабочымі другіх фабрык і заводаў. Рабочыя заводу «Энэргія» ў Менску таксама заявілі аб неабходнасьці павялічэньня пазыкі.

Зразумела, што гэтыя прапановы зусім жыцьцёвы і іх павінна падтрымаць уся пралетарская грамадзкасьць нашай краіны. Ня гладзячы на поўнае выкананьне кантрольных лічбаў па пазыцы, ёсьць яшчэ цэлыя шэрагі рабочых і асабліва сялян, якія неахоплены падпіскай на пазыку.

Ужо пасьля таго, як была афармлена калектыўная падпіска на пазыку на фабрыкі прышлі новыя сотні і тысячы рабочых (асабліва з часу пераходу прадпрыёмстваў на бесперарыўны рабочы тыдзень), якія таксама жадаюць прыняць удзел у падпісцы на пазыку.

Апроч таго, у нас ёсьць яшчэ слабае месцы па падпісцы на пазыку—гэта вёска. У БССР на вёсцы кантрольныя лічбы пазыкі выкананы толькі на 75,6 процантаў. Шмат сялянства яшчэ не падпісалася на пазыку па тэй прычыне, што былі заняты сяўбой, абмалотам. Менавіта, цяпер самы спрыяючы час для падпіскі на пазыку сярод сялянства.

Выходзячы з гэтага Наркамфін СССР хадайнічае перад урадам ад павялічэньні III пазыкі індустрыялізацыі на 150 мільёнаў.

Усё гэта накладвае на ўсю савецкую грамадзкасьць абавязак ня спыняць кампаніі па распаўсюджваньні пазыкі, а згрупаваць увагу на тых вучастках гэтае рачоты, дзе падпіска адставала. Трэба разгарнуць шырэй кампанію на вёсцы, трэба абхапіць падпіскай новыя кадры рабочых, якія яшчэ ня ўдзельнічалі ў падпісцы, трэба ўцягнуць у гэтую справу новыя сотні і тысячы пралетарыяў і сялянства.

Нельга спыняцца на тых дасягненьнях, якія ёсьць у гэтай галіне, трэба яшчэ шырэй разгортваць кампанію за падпіску на III пазыку індустрыялізацыі.

АБАРОНА ПОЛЬСКАЙ ПАЛІЦЫІ.

Абураючае цкаваньне паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы.

ВАРШАВА, 24-X. «Кур'ер Цодзенны» зьмяшчае сёньня абураючы артыкул, накіраваны супроць паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у сувязі з перадачаю ў рукі паліцыі некага Міраноўскага, які зьявіўся ў паўнамоцнае прадстаўніцтва з правакацыйнымі прапановамі. Гэтае выступленьне бульварнай газэты адбылося не бяз інсьпірацыі поўных палітычных колаў, з якімі «Кур'ер Цодзенны» знаходзіцца ў шчыльнай сувязі. Паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР заявіла міністэрству замежных спраў пратэст супроць гэтага артыкулу. Але ўся гэта кампанія набывае зусім пэўны сэнс, калі дадаць, што, як было вядома ў паўнамоцным прадстаўніцтве, выдадзены паліцыі Міраноўскі ўжо вызвалены. Гэта лішні раз пацьвярджае характар заняткаў Міраноўскага і характар яго адносін да варшаўскай паліцыі.

Бульварны друк працягвае брахню аб савецкім паўнамоцным прадстаўніцтве.

ВАРШАВА, 25-X. Брахня ў бульварным друку навакол савецкага паўнамоцнага прадстаўніка ў Варшаве ня спыняецца. У сувязі з выдачай савецкім паўнамоцным прадстаўніцтвам паліцыі заведамага правакатара, які зьявіўся ў поўнамоцнае прадстаўніцтва, «Кур'ер Чырвоны» выступае з новымі „выкрыцьцямі", накіраванымі гэты раз супроць перакладчыка савецкага вайсковага аташэ Пётры Бяссонава.

Газэта надае фантастычную гісторыю аб тым, што Бяссонаў, нібыта, угаварваў некага польскага афіцэра дастаўляць яму шпіёнскія весткі. Правакацыйныя „выкрываньні" «Кур'ера Чырвонага» цалкам перадрукаваны органам пілсудчыкаў «Глос Правды». «Глос Правды», як відаць, занепакоен тым, што паўнамоцнаму прадстаўніцтву стала вядома, што выдадзены паліцыі правакатар Міраноўскі быў зараз-жа вызвалены. Газэта спрабуе вельмі беспадстаўна растлумачыць гэты факт тым, што ён ня меў ніякага доступу да афіцыйных матар'ялаў.

Стрэл у рабочага агітатара.

ВАРШАВА, 25-X. З Лодзі паведамляюць, што ў часе выступленьня аднаго агітатара на масоўцы рабочых фабрыкі Бідэрмана, невядомая асоба падышла да прамоўцы Германа і стрэліла ў яго. Рабочыя перанесьлі прамоўцу ў аптэку, адкуль ён быў перавезены ў шпіталь у безнадзейным становішчы. Асоба, якая ўчыніла замах, уцякла.

Водлуг паведамленьня газэт, Герман сказаў на масоўцы прамову аб становішчы ў СССР, у сувязі з чым узьнікла меркаваньне аб тым, што Герман знаходзіўся ў складзе рабоча-сялянскай польскай дэлегацыі, якая наведала СССР і што ён выступаў са справаздачаю аб сваім падарожжы. Буйдаўскі друк зазначае, што [illegible] самастойны [illegible] агентам паліцыі.

Ваенныя падрыхтоўкі Польшчы.

БЭРЛІН, 25-X. Водлуг паведамленьня „Дэйтшэ Альгемэйнэ Цэйтунг" з Данцыгу, польскі ўрад паведаміў усім уласьнікам прыватных пад'язных чыгунак, якія знаходзяцца на тэрыторыі вольнага гораду Данцыгу, што ў выпадку мабілізацыі ці вайны гэтыя чыгункі павінны быць неадкладна перададзены пад загад польскай вайсковай улады. Гэты новы польскі ваенны захад выклікаў вялікае абурэньне сярод насельніцтва Данцыгу, з прычыны таго, што згодна данцыгскай канстытуцыі тэрыторыя Данцыгу не павінна служыць базай для ваенных апэрацый якой-небудзь дзяржавы. Як відаць, данцыгскі ўрад заявіць пратэст супроць новага польскага захаду.

ЗВАРОТ НЯМЕЦКАГА КОНСУЛА да КІТАЙСКАЙ УЛАДЫ

ПРОСЬБА АБ ПАЛЕПШАНЬНІ СТАНУ САВЕЦКІХ ЗЬНЯВОЛЕНЫХ ЗАСТАЛАСЯ НЕЗА ДАВОЛЕНАЙ.

ТОКІЁ, 25-X. Нямецкі генэральны консул у Харбіне Штобэ зьвярнуўся да кітайскай улады з наступным хадайніцтвам аб савецкіх зьняволеных у Сумбэйскім лягеры: 1) з прычыны холаду перавесьці сумбэйцаў у парожныя памяшканьні ў горадзе; 2) вызваліць з Сумбэю ўсіх жанчын; 3) разьмясьціць сем'і зьняволеных у парожных чыгуначных кватэрах; 4) дазволіць яму наведаць усіх арыштаваных, зьняволеных у вайсковым штабе, чаго да гэтага часу не дазвалялася.

На ўсе свае патрабаваньні Штобэ атрымаў адмову.

Хваляваньне пэйпінскіх рыкшаў.

Арыштавана больш 1200 асоб.

ПЭЙПІН, 24-X. У сувязі з хваляваньнямі сярод пэйпінскіх рыкшаў, арыштавана больш за 1200 асоб, у тым ліку сябра выканкому фэдэрацыі прафсаюзаў Чэн-Чы-Сю, якога лічаць кіраўніком сучасных непарадкаў. Некаторыя з арыштаваных асоб амаль што страцілі прытомнасьць, бо ім не давалі есьці на працягу 24-х гадзін.

Жоўты саюз трамвайных рабочых сёньня сьвяткаваў сваю „перамогу" над рыкшамі, наладзіўшы дэманстрацыйны праезд сябраў саюзу ў трамвайных вагонах па ўсяму гораду. З 22-га кастрычніка горад уночы абвяшчаецца на ваенным становішчы.

Думаюць, што катэгарычны пратэст францускага пасланьніка ў Пэйпіне павялічыў рэпрэсыўныя меры супроць рыкшаў. Апроч саюзу рыкшаў, улада распусьціла таксама прафсаюзы падмятальшчыкаў вуліц, і інш. рабочых.

ДА II СЭСІІ ЦВК БССР.

Скліканьне II сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, ВЫЗНАЧАНАЕ НА 13-ГА ЛІСТАПАДА 1929 Г. пераносіцца на 20-га лістапада, А ТАКСАМА ЗЬЕЗД РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ЛАТЫШОЎ з 15-га лістапада ПЕРАНОСІЦЦА на 24-га лістапада.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

ЗАБАСТОВАЧНЫ РУХ ГАРНЯЦКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

УЗМАЦНІЎСЯ ПАЛІЦЭЙСКІ ТЭРОР.

Рэфармісты заключылі саюз з паліцыяй для расправы з бэльгійскімі гарнякамі.

ПАРЫЖ, 24-X. Чакаючы назначанай на сёньня аднадзённай забастоўкі бэльгійскіх гарнякоў, рэфармісты, жадаючы адцягнуць рабочых ад рэвалюцыйных масавых выступленьняў, спрабуюць надаць забастоўцы характар мірнай дэманстрацыі.

Рэфармісты зьвярнуліся да паліцыі гораду Шарлеруа з просьбаю перашкодзіць усякай дэманстрацыі пад лёзунгамі, на якія не далі сваёй згоды рэфармісты.

Паліцыя папярэдзіла гарнякоў, што ім дазволены дэманстрацыі толькі па пляну рэфармісцкага прафсаюзу і ў зацьверджаным рэфармістамі складзе.

Орган бэльгійскай кампартыі „Драпо Руж" падкрэсьлівае, што рэфармісты і паліцыя адкрыта заключылі паміж сабою баявы саюз, і заклікае гарнякоў Шарлеруа дэманстраваць супроць сацыял-фашысцкіх лідэраў—саюзьнікаў каніталістаў і паліцыі, за павялічэньне заработку і перамогу клясавых патрабаваньняў гарнякіх мас. Учора ў памяшканьні ЦК бэльгійскай кампартыі ў Брусэлі паліцыя ўчыніла вобыск з мэтаю забраць першатвор закліку бюро кампартыі Бэльгіі да забастоўкі і дэманстрацый 24 кастрычніка. Вобыск ня даў ніякіх вынікаў.

Кампартыя раскрывае подлыя намеры рэфармістаў.

ВЕНА, 24-X. Учора адбылася кан... рэфармісцкіх прафсаюзаў. Ба... насканавіла, што кожны з прафсаюзаў павінен склікаць у самым блізкім часе агульна-аўстрыйскую канфэрэнцыю для абмеркаваньня эканамічнага і палітычнага становішча, а таксама для выпрацоўкі зададзеў абароны супроць замаху на правы аўстрыйскага пралетарыяту.

У сувязі з гэтай пастановай ЦК аўстрыйскай кампартыі агаласіў у „Ро... ...алозу. У адозьве зазначана: ...справу, а то зводзе... ...ці сацыяльных ...які толькі пе... ...дэмакратычная ...перабе... ...працоўніцтва з фашысцкім урадам Шобэра". Далей адозва прапануе рабочым неадкладна перайсьці да канкрэтных захадаў барацьбы. За зьмяшчэньне гэтай адозвы сёньнешні нумар „Ротэ Фанэ" канфіскаваны. Адказны рэдактар газэты Мікш арыштаван.

Пляны рэфармістаў аказаліся бітымі.

ПРАГА, 24-X. Не зважаючы на тое, што рэфармістам удалося ў некаторых капальнях Паўночна-чэскага вугольнага басэйну пераканаць рабочых адняць працу, сёньня прадаўжаюць баставаць каля тысячы гарнякоў.

У раёне Бруху ўлада фактычна ўвяла надзвычайнае становішча. Выдадзен загад аб забароне выходзіць на вуліцу пасьля 9 гадзіны.

У Бруху згрупаваны значныя сілы жандармэрыі і паліцыі. Учыняюцца касавыя арышты.

Забастоўка Верхня-сілескіх гарнякоў

БЭРЛІН, 24-X. У капальні «Адвэр» каля Мількушуца (Верхняя Сілезія) абвясьцілі забастоўку 500 маладых гарнякоў, патрабуючы павялічэньня заработку, скасаваньня ўзысканьняў і інш. Сход бастуючых быў разагнаны паліцыяй.

Міністэрскі крызіс у Францыі.

Сацыяліст Бонкур можа быць прэм'ерам.

„Замежная палітыка Брыяна павінна застацца нязьменнай".

ПАРЫЖ, 24-X. Сёньнешнія газэты сур'ёзна лічацца з магчымасьцю кандыдатуры сацыяліста Бонкура на пасаду прэм'ера ўраду, складзенага з сацыялістаў, радыкалаў і прыхільнікаў Лушэра. У гутарцы з прадстаўнікамі друку Бонкур, пасьля таго, як быў прыняты прэзыдэнтам Думэргам, заявіў: „Замежная палітыка Брыяна павінна заставацца нязьменнай". Левабуржуазныя газэты выказваюць надзею, што сацыялістычная партыя на надыходзячым пленуме ЦК „наблізіцца да ўдзелу ва ўрадзе".

Францускія сацыялісты апрацоўваюць грамадзкую думку.

ПАРЫЖ, 24-X. Француская сацыялістычная партыя агаласіла маніфэст да рабочай клясы і ўсіх дэмакратаў, у якім між радкоў дае зразумець магчымасьць фармаваньня ўраду сацыялістамі ці ўдзелу сацыялістаў у „левым урадзе". „Сацыялістычная партыя—зазначана ў маніфэсьце,—будзе імкнуцца забясьпечыць прадоўжаньне мірнай палітыкі і спрыяць складаньню ўраду, адпавядаючага сапраўдным суадносінам сіл у парлямэнце і ў краіне".

Буйна-буржуазны друк вельмі па рознаму выказваецца на пытаньні аб пажаданасьці перадачы ўлады сацыялістам. „У сучасны момант,—заўважае газэта Журнэ Эндустрыэль,—калі эканамічнае становішча і асабліва стаўвішча сельскай гаспадаркі патрабуе ўжыцьця тэрміновых захадаў, неабходна, каб ва ўладзе стаяў моцны ўрад".

Складаньне новага габінэту даручана старшыні партыі радыкалаў.

ПАРЫЖ, 25-X. Прэзыдэнт Думэрг даручыў Тард'е (старшыня партыі радыкалаў) скласьці новы габінэт. Заўтра Тард'е паведаміць прэзыдэнту, ці здолее ён выканаць гэтае даручэньне.

Буйная галадоўка палітзьняволеных у Вэнгрыі.

Урад адмаўляецца прызнаць камуністаў палітычнымі зьняволенымі.

ВЕНА, 24-X. Адначасна з палітычнымі зьняволенымі будапэшцкага цэнтральнага астрогу абвясьцілі галадоўку палітычныя зьняволеныя ўсіх цывільных астрогаў Вэнгрыі. Галадоўкаю кіруюць камуністы; у ёй удзельнічае 270 зьняволеных, з іх 12 жанчын. Удзельнік галадоўкі Ракошы цяжка хварэе ўжо на працягу некалькіх тыдняў.

У Вэнгрыі ніколі ня было такой буйнай галадоўкі. У сёньняшніх вэнгерскіх газэтах агалошана афіцыйнае паведамленьне міністэрства юстыцыі, якое ўкосна прызнае, што з камуністамі абыходзіліся ў астрогах горш, чым з іншымі зьняволенымі. Далей урад заяўляе, што ён лічыць галадоўку «процізаконнай» і адмаўляецца прызнаваць камуністаў палітычнымі зьняволенымі. У сувязі з галадоўкаю учора былі арыштаваны сваякі некаторых зьняволеных на абвінавачаньні ў дастаўцы зьняволеным карэспандэнцыі з волі.

Продаж аблігацый 3 пазыкі індустрыялізацыі працягнут па 30 лістапада.

МАСКВА, 24-X. Продаж аблігацый 3 пазыкі індустрыялізацыі на асабісты рахунак у гарадох і паселішчах гарадзкога тыпу прадоўжаны па 30 лістапада г. г. уключна. Продаж аблігацый будзе адбывацца ва ўсіх крэдытных установах і касах ашчадасьці.

РАБОЧЫЯ БССР—ЗА ДАДАТКОВЫ ВЫПУСК ПАЗЫКІ

Патрабуем павялічэньня падпіскі.

(Старшыня ЦП саюзу мэталістаў т. Іваноў).

— Ужо ёсьць заявы груп рабочых ...торых нашых прадпрыёмстваў аб ...лічэньні выпуску 3 пазыкі індустрыялізацыі. Зусім слушна, што сапраўдныя арганізацыі павінны падтрымаць падобныя просьбы і прыняць заходы да правядзеньня у жыцьцё. Нагадваньні нашага ЦП мы пастанавілі на падставе заключанага дагавору з спаборніцтва паміж усімі ЦП саюзу аб уцягненьні усіх рабочых у падпіску ня менш, як на месячны заработак—правесьці праверку выкананьня гэтага дагавору.

Апроч гэтага, мы стаім перад фактам уцягненьня ў нашу прамысловасьць новых дзесяткаў і сотняў рабочых. На некаторых заводах паступіла ...60 проц. новых рабочых. Ці ўцягнем мы гэту масу ў падпіску? Трэба сказаць, што не. Тымчасам, гэтыя новыя кадры рабочых могуць і павінны ...пісацца на пазыку.

Каб ня быць галаслоўным, трэба адзначыць, што толькі на аднаму заводу „Энэргія" мы маем наступнае павялічэньне рабочых: на 1 красавіка г. г. было 469 рабочых, на 1 кастрычніка г. г.—768. На заводу „Камунар" на 1 красавіка—543, на 1 кастрычніка—600 і г. д. Новыя рабочыя прыняты амаль ва ўсіх заводах у той час, калі афармленьне на падпіску было скончана, а таму і не маглі прыняць удзелу ў падпісцы.

— Задача саміх рабочых, якія ўжо ўцягнуты ў падпіску,—кажа т. Іваноў,—праверыць саміх сябе, наколькі выкананы падпісаны дагавор, а таксама ўцягнуць у падпіску тых рабочых, якія да гэтага часу ня прынялі яшчэ ўдзелу ў ёй.

Гэта заданьне павінны быць выкананы тэрмінова і поўнасьцю.

І.

Падтрымаем ініцыятыву маскоўскіх рабочых

(*Нам. старшыні саюзу паперніка́ў, рабочы вылучэнец т. Станкевіч*).

3-я пазыка індустрыялізацыі з поспехам распаўсюджана сярод рабох-паперніка́ў Беларусі. Кантрольныя лічбы выкананы, а па некаторых фабрыках і заводах—нават з перавышэньнем. Асобныя рабочыя падпісаліся на 200-250 проц. свайго месячнага заработку.

Заклік маскоўскіх пралетарыяў аб павялічэньні сумы пазыкі павінен знайсьці належны водгук сярод рабочых Беларусі. Мы павінны дабіцца ...ўнага 100 проц. ахопу падпіскай ...цоўных гораду і вёскі.

На Савецкай Беларусі заданьне па рэалізацыі пазыкі выканана на 134 проц. Мы стаім на першым месьце ў параўнаньні з іншымі рэспублікамі. Гэта абавязвае нас не паслабіць тэмпу распаўсюджваньня пазыкі індустрыялізацыі.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на ўзмацненьне падпіскі сярод вясковага насельніцтва, дзеля чаго павінны быць прыцягнуты рабочыя фабрык і заводаў.

Цэнтральнае праўленьне саюзу паперніка́ў усямерна падтрымлівае прапанову аб павялічэньні сумы пазыкі і шырокага абгаворыць гэтае пытаньне на рабочых сходах.

Мясцкомы саюзу савгандльслужачых, адгук нецеся!

У той час, калі па цэлым шэрагу індустрыяльных прадпрыёмстваў рабочыя выносяць пастановы аб тым, каб павялічыць выпуск сумы 3-й пазыкі індустрыялізацыі, нізавыя ячэйкі саюзу савгандль служачых БССР маўчаць, як вады ў рот набраўшы. Трэба сказаць адкрыта, што ў гэтай важнай кампаніі саюз савгандльслужачых кладзе ў хвасьце. Цэнтральны орган саюзу „Наша Газета" ужо абмяркоўваў гэта пытаньне, зусім салідарызуючы з тымі арганізацыямі, якія ўжо высунулі перад савецкім урадам запатрабаваньні аб павялічэньні выпуску 3-й пазыкі.

— Бачыце,—заўважаюць некаторыя мясцкомы,—нам зараз няма часу, у нас праводзіцца чыстка партыйных ячэек...

— Дарагія таварышы, гэта не павінна служыць прычынай таму, каб праходзіць моўчкі міма важных палітычных пытаньняў. Няўжо мясцкомам нават ня хопіць часу, каб выслухаць голас мас па пытаньню аб павялічэньні падпіскі на 3-ю пазыку?

Служачы.

Шырэй распаўсюдзім пазыку на вёсцы.

Члены саюзу сельгаслесрабочых не стаюць ад рабочых індустрыяльных прадпрыёмстваў у справе пашырэньня ...й пазыкі індустрыялізацыі. Апрача ...шырэньня пазыкі сярод членаў свайго саюзу, прымаюцца захады, каб узмацніць тэмп распаўсюджаньня пазыкі сярод сялянскага насельніцтва. У сувязі з гэтым ЦП саюзу сельгаслесрабочых пастанавіў праз сваю газэту „Беларускі Батрак" дапамагаць усямернаму пашырэньню пазыкі індустрыялізацыі на вёсцы.

Яшчэ 150 мільёнаў на індустрыялізацыю.

Дадатковы выпуск пазыкі індустрыялізацыі.

З прычыны паступленьня шматлікіх патрабаваньняў з боку рабочых арганізацыяў аб павялічэньні сумы пазыкі, НКФ СССР ўвайшоў ва ўрад з прапановаю аб дадатковым выпуску пазыкі індустрыялізацыі на 150 мільёнаў руб.

Дадатковы выпуск мае на мэце ахапіць яшчэ ня ўцягнутыя пазыку масы рабочых і сялян і неарганізаванага насельніцтва. У сувязі з гэтым камісія садзейнічаньня павінна ўлічыць асоб, якія ня прыймалі ўдзелу ў падпісцы і правесьці сярод іх шырокую агітацыйную кампанію. Гарадзкія рабочыя арганізацыі, асабліва ...эфскія таварыствы і прафсаюзы, зьвязаныя з вёскай, павінны ...звярнуць асаблівую ўвагу на распаўсюджаньне пазыкі ў вёсцы, ...кая да гэтага часу дала толькі 56 проц. кантрольных лічбаў.

У БССР рэалізавана пазыкі на 15.122.000 руб.

134,4 проц. заданьня выканала БССР.

Паводле вестак Наркамфіну да 20 кастрычніка па ўсёй БССР рэалізавана 3 пазыкі індустрыялізацыі на 15.122.000 руб., ...о складае 134,4 проц. кантрольнай ...лічбы.

Па асобных групах рэалізацыі на гэты ...ень дала такія вышкі: рабочыя і слу...чыя сваю кантрольную лічбу выканалі ... 142,6 проц., сярод сялянства рэалізавана пазыкі на 1134500 руб., альбо 75,6 проц. кантрольнай лічбы. Асабліва слаба праходзіць рэалізацыя пазыкі сярод сялянства ў Бабруйшчыне, Гомельшчыне і Мазыршчыне, дзе заданьне выканана толькі ад 59 да 61,8 проц.

У галіне афармленьня падпіскі таксама яшчэ зроблена далёка ня ўсё: да 20 кастрычніка падпіска афармлена на 12797800 руб., ці 84,6 проц. агульнай сумы.

СВАЕЧАСОВА ЎЗЯЦЬ ПАТРЭБНЫ ТЭМП

Ажыцьцяўленьне вялічэзнага размаху наступальнага руху прамысловасьці, запраэктаванага ў кантрольных лічбах на 1929-30 год, у значнай меры залежыць ад пасьпяховага вырашэньня задачы па зьніжэньні сабекошту на 11 процантаў. Матар'яльны эфэкт, які павінен атрымацца ў выніку такога зьніжэньня раўнасцца амаль што палове ўсяго аб'ёму капітала-ўкладаньняў у прамысловасьць. Кожны процант заданьня па сабекошту складае ў фінансавым пляне велічыню, блізкую да кошту пабудаваньня такіх волатаў, як Магнітстан, Кузнецстан і г. д. Бясспрэчна, на прамысловасьць ускладзена заданьне вялікай цяжкасьці, складанасьці і адказнасьці. Але шматразовае абмеркаваньне пытаньня ва ўсіх органах і інстанцыях паказала, што гэта заданьне зусім рэальнае, і яго можна выканаць. Леташняя кампанія па зьніжэньню сабекошту характэрна ня толькі тым, што, замест устаноўленых плянам 7 проц., зьніжэньне было даведзена толькі да 4,5 проц. Яна характэрна і суадносінамі вынікаў двух паўгодзьдзяў, з якіх у першых паўгодках зьніжэньне дасягнула толькі 2,3 проц., а ў другіх паўгодках—9 проц. Гэта наглядна паказвае, як многа каштоўнага часу было патрачана на раскачваньне.

Вядомая рэч, на барацьбу за зьніжэньне сабекошту ў новым годзе мы выступаем значна больш моцнымі і арганізаванымі. Рашаючая перавага ў параўнаньні з леташнім годам заключаецца ў тым, што дасягнут грунтоўны пералом ва ўсіх вытворчых абставінах. На фронце працы пакладзен добры пачатак шырокаму сацыялістычнаму наступу на прагулы, прастоі, п'янку, рвацтва, цэхаўшчыну, бэзгаспадарчасьць і г. д. Усе дасягненьні, увесь накоплены вопыт мы абавязаны поўнасьцю перанесьці і прадаўжыць у новай кампаніі і, што самае галоўнае, зрабіць гэта свае часова.

Важнейшым фактарам намечанага ў бягучым годзе зьніжэньня сабекошту зьяўляецца павялічэньне вытворчасьці працы на 23,4 проц. Такі выключна высокі рост ня можа быць дасягнуты самацёкам. Вопыт мінулага году вельмі навучальны і ў галіне ўзьнаўлення вытворчасьці працы. Мы ня толькі мелі недавыкананьне плянавага заданьня на 3,8 проц., але маем малюнак надзвычайна рэзкага разнабою паміж асобнымі галінамі прамысловасьці. Гэта паказвае, што ў нас далёка ня ўсюды добра.

Націскала на вытворчасьць летась і яўная непармальнасьць з уцягненьнем новай рабочай сілы. Намечанае плянам павялічэньне рабочай сілы на 3,8 проц. было востра перавялічана. Выканаць заданьне па прадукцыйнасьці ў бягучым годзе можна толькі адным шляхам — прадоўжыць сацыялістычнае наступленьне на фронце якасных паказчыкаў па працы.

Адгэтуль новыя задачы, якія стаяць перад прафсаюзамі. Павярнуць прафрух тварам да вытворчасьці, выкрыць трэд-юніёнісцкія ўстаноўкі невялічкай часткі прафсаюзных права-укланістаў, мабілізаваць і ўцягнуць шырокія рабочыя масы на творчы парыў і энтузіязм да пераможаньня цяжкасьцяў пяцігодкі,—вось катэгарычныя патрабаваньні, якія партыя прад'яўляе да кожнага прафпрацаўніка, да ўсяго прафактыву. Разгарнуць актыўнасьць рабочай клясы, расчысьціць дарогу рабочай ініцыятыве, узмацніць барацьбу з бюракратызмам і бюракратамі на вытворчым фронце, аказаць энэргічную дапамогу дзесятку тысяч ударных брыгад, якія ў нас утвораны, шырока разгарнуць працу гэтых брыгад, уліць у іх новыя сотні тысяч рабочых,—вось ленінскі, бальшавіцкі вымест прафсаюзнай працы ў варунках сацыялістычнага будаўніцтва.

Надзвычайна адказныя функцыі ўскладаюцца ў новых умовах на кіраўнікоў гаспадаркі. Адзіначальле—самы сур'ёзны інструмант сацыялістычнай будовы. Але карыстацца ім гаспадарнікі павінны па-бальшавіцку. Умець пагоджваць паўнату кіраўніцтва з правільным разьмеркаваньнем сіл, улічваць і свае часова рэалізаваць рабочую ініцыятыву, заснаваць поўны кантакт з вытворчымі парадамі, дапамагаць ударным брыгадам—такія задачы адзіначальля. Патрэбна канкрэтнасьць заданьняў па сабекошту для кожнага асобнага прадпрыёмства і нават яго цэхаў; на кожным заводзе трэба ў самы кароткі тэрмін выпрацаваць зусім дакладны плян, за кошт якіх элемэнтаў павінны быць зьніжаны затраты вытворчасьці. Заводзкія партыйныя ячэйкі павінны ўзяць самы энэргічны ўдзел у выпрацоўцы гэтага пляну. Трэба дамагчыся, каб рабочая маса выразна бачыла, якія вучасткі вытворчасьці кульгаюць, і што іменна павінна быць зроблена, каб выканаць плян па зьніжэньні. Няма ніякага сумненьня, што, не зважаючы на апартуністычныя спробы „затармазіць", не зважаючы на прароцтвы „аб недасягаемасьці", рабочая кляса пры энэргічным творчым удзеле ўсіх партыйных арганізацый справіцца з сваімі задачамі на сучасным чарговым этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

„Правда".

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ—ПРАВЕРКА КЛЯСАВАЙ ВЫТРЫМАНАСЬЦІ І ПРАЦАЗДОЛЬНАСЬЦІ АПАРАТУ

У Бабруйскай акрузе маюць месца выпадкі скрыўленьня клясавай лініі ў загатоўках.—У Мазыршчыне ёсьць выпадкі здачы замест зярна адкідаў. —У Гомельшчыне слаба націскаюць на кулаччо.—У Полаччыне—ажыятаж у загатоўках.

БОЛЬШ КЛЯСАВАЙ ВЫТРЫМАНАСЬЦІ У ЗАГАТОЎКАХ! ЗА БАЯВЫЯ ТЭМПЫ ПРАЦЫ АПАРАТУ!

Не дапусьцім скрыўленьняў клясавай лініі ў хлебазагатоўках.

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта).

Становішча працы па хлебазагатоўках у Бабруйскім раёне паказвае, што справай гэтай раённы цэнтр амаль што зусім ня кіруе. Ёсьць сельскія саветы, як, напрыклад, Цялускі і Мальлеўскі, куды па правядзеньню хлебазагатовак з раёну ніхто не прыяжджаў.

Мала гэтага, дырэктыва, якая дадзена па сельскіх саветах адносна хлебазагатавіцельнай працы, ня мае пэўнай клясавай устаноўкі. У гэтай дырэктыве нават гаворыцца, што сельскія саветы маюць права ўжываць і накладаць спагнаньні на ўсіх бяз выключэньня гаспадароў, якія ня выконваюць пастаноў сходу аб хлебазагатоўках.

Бяз кіраўніцтва і чоткіх дырэктыў праца пайшла стыхійна і з гэтае прычыны наглядаецца шэраг скрыўленьняў клясавай лініі. Кулак аказаўся абкладзен слаба. Возьмем, напрыклад, вёску Панкратавічы: трое кулакоў-індывідуальнікаў, якія плацяць ад 200 да 400 руб. падатку, атрымалі па раскладцы —першы 17 пуд., другі—7 пудоў і трэці 6 пуд. Гэта зроблена ў той час, як серадняк Еўстратчык абкладзен у 5 пудоў.

Такіх выпадкаў многа ў сельсавеце. Вось гр. Зайчанка Лявон мае 13 дзес. зямлі, плаціць 67 руб. падатку, атрымаў заданьне здаць... 2 пуды хлеба. Гр. Санковец, які плаціць 97 руб. падатку, мае 20 дзесяцін зямлі, 2 коняй і 6 кароў—атрымаў заданьне здаць 4 пуды хлеба. Гэта ў той час, як беднаку Абрамчыку Макару, што плаціць 7 руб. падатку, прапанавана здаць пуд хлеба.

Па Цялускаму с.-с. наглядаецца такое самае становішча. Калі-ж па дабраахвотнай здачы ня была выканана колькасьць, дадзеная на сельсавет, сельсавет прыступіў да прымусовага спагнаньня хлеба, прычым цяжар гэтага мерапрыемства ўпаў не на кулацтва, а серадняцтва і часткова беднату, бо разьмеркаваньне было зроблена амаль што пароўну на ўсіх.

Ёсьць выпадкі, калі раскладка хлеба, які павінен паступіць па хлебазагатоўках, праводзілася ад дзесяціны.

Падбор камісій садзейнічаньня правядзеньню хлебазагатовак ня ўсюды здавальняюча. Ёсьць выпадкі, калі старшынямі гэтых камісій зьяўляюцца кулакі-індывідуальнікі.

Патрэбна тэрміновыя мерапрыемствы, каб выправіць скрыўленьне клясавай лініі, якое практыкуецца тут. Раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі павінны прыняць гэта пад увагу і накіраваць сваю працу па правільнаму клясаваму шляху. Працаўнікі з раённага асяродку павінны быць кінуты на вёску для кіраўніцтва хлебазагатавіцельнай працай.

А. Дамброўскі.

Неабходна выправіць недахопы ў хлебазагатоўках.

(Мазыршчына).

Вызначанае заданьне дабраахвотнай здачы лішкаў хлеба прынята ўсімі сельсаветамі і вёскамі, але да гэтага часу не ўва ўсіх вёсках даведзена гэтае заданьне да с.-г. двароў. Пры раскладках здачы хлеба с.-г. двароў дапушчаны выпадкі прымусам і арганізацыі [illegible] ў [illegible] вёскі.

Некаторыя хлебазагатавіцелі, пасьля давядзеньня раскладкі здачы хлеба на дварох, паслабляюць увагу і працу, думаючы, што загатоўкі пойдуць самацёкам. Дзякуючы гэтаму, тэмп хлебазагатовак замаруджваецца. Нават, акрангдлем заданьне па хлебазагатоўках на кастрычнік месяц акруговым загатавіцелям разаслана 10 кастрычніка. Заўважваюцца выпадкі здачы і прыёму хлеба сурагатам: здаюць замест жыта засьмечаную грэчку, альбо шалуху з якое-небудзь хлебнае культуры.

Многія сельскія камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам бязьдзейнічаюць, пры адсутнічаньні належнага кіраўніцтва імі з боку райвыканкомаў. У склад некаторых камісій трапілі заможнікі і кулакі, якія падрываюць хлебазагатоўкі хаваньнем хлебных лішкаў, між тым, райвыканкомамі зусім слаба скарыстаны [illegible] Гандлю БССР і народны камісарыят [illegible] заможнікоў і кулакоў, якія ўхіляюцца ад здачы хлеба. Пракуратура таксама недастаткова сыгналізуе недахопы ў гэтай галіне.

Сходы беднаты праведзены па пытаньнях арганізацыі дабраахвотнай здачы лішкаў хлеба, але зараз праца з беднатой праводзіцца слаба.

Апроч гэтых заўваг, характэрна адзначыць, што папы таксама распачалі „хлебазагатоўкі",—зразумела для асьлістых патрэб і згодна ўмоў па ўтрыманьню цэркваў. Трэба адзначыць адсутнічаньне ў акрузе антырэлігійнае прапаганды.

Усе гэтыя недахопы і скрыўленьне клясавай лініі ў хлебазагатоўках неабходна выправіць у бліжэйшы час.

М. Зеляноўскі.

Да адказнасьці за бязьдзейнасьць

Ва ўрадавай камісіі паведамілі, што за апошнія дні выяўлена складаў на 400000 пуд. хлеба. Такім чынам на сёньняшні дзень складачных памяшканьняў маецца на 5100—5200 тысяч пуд.

Атрымана паведамленьне, што пытаньне збору тары ў Полаччыне, Віцебшчыне пачынае займаць належнае месца ў працы мясцовых арганізацый. У Полацку за першы дзень сабрана 500 мяшкоў. У Воршы вылучана рабочая брыгада для выяўленьня памяшканьняў пад склады і для збору тары.

Урадавая камісія накіравала шэраг спраў у пракуратуру для прыцягненьня да адказнасьці за несвачасовы вываз і за непередачу складаў адпаведным арганізацыям. Бабруйскаму пракурору накіравана справа аб прастоі 33-х вагонаў Акрсаюзу і Лесбелу. У Менску перададзена справа ў пракуратуру аб Белдзяржстрою за нявываз каменьняў са станцыі Менск. У Магілёўшчыне прыцягваецца да адказнасьці цэлы шэраг арганізацый, якія не працавалі ў нядзелю 20-га кастрычніка па прыёму хлеба і бульбы.

Разьюшаны кулак не сустракае належнага адпору.

(Гомельская акруга).

У выніку мабілізацыі ўвагі савецкае грамадзкасьці да хлебазагатовак ва ўсіх раёнах акругі ўзмацніўся тэмп загатовак. Водлуг даных Райсаюзу, спажывецкая каапэрацыя на 15 кастрычніка загатавала 3120 тон хлебных прадуктаў, што складае 51,5 проц гадавога заданьня.

Першае месца па выкананьні пляну займае Чэчэрскі раён, які загатовіў 89,2 проц. гадавога пляну. Асобныя спажывецкія таварыствы ўжо цалком выканалі свой гадавы плян. Другое мейсца займаюць Буда-Кашалёўскі раён, выканаўшы сваё гадавое заданьне на 80,6 проц. Камарынскі раён значна падцягнуўся і ва ўсіх вёсках кампанія хлебазагатовак шырока разгарнулася. Гадавы плян выканан у разьмеры 74 проц. Уваравіцкі раён загатаваў 71,8 проц. гадавога пляну, Церахоўскі—62, Лоеўскі—65, Веткаўскі—65, Рачыцкі—48,3 проц.

Па ранейшаму адстае Хойніцкі раён—41,1 проц. гадавога заданьня, Брагінскі—28,9 проц. і Гомельскі—31,5 проц. У гэтых раёнах яшчэ да гэтага часу асобныя спажывецкія таварыствы не загатавалі ні воднага фунта. Асаравіцкае спажывецкае таварыства загатавала толькі 13 клгр.

У некаторых раёнах ажыўленьню хлебазагатовак дапамагае сацыялістычнае спаборніцтва, якое праводзіцца паміж спажывецкімі таварыствамі і нават паміж асобнымі гаспадаркамі. Так, вёска Радзінск праводзіць спаборніцтва з вёскай Баршчова. У вёсцы Гавеновічы, Рэчыцкага раёну, праводзіцца спаборніцтва паміж гаспадаркамі на 100 проц. выкананьне гадавога пляну.

Трэба адзначыць, што хлеб паступае, галоўным чынам, ад бядняцкай і серадняцкай часткі сялянства. Кулакі розным чынам імкнуцца затрымліваць свой хлеб. Яны сьвядома псуюць свае малатарні з тым, каб кожна было ўхіліцца ад здачы хлебных лішкаў. У некаторых вёсках кулакі шкодзяць хлебазагатоўкам шляхам распаўсюджаньня няверных чутак, пагроз беднаце і падпалам гаспадарак вясковых грамадзкіх працаўнікоў.

Так, у вёсцы Чыкалевічы, Камарынскага раёну кулакі рабілі замах на жыць цё ўпаўнаважанага па загатоўках Леаненка Я. П. У вёсцы Вялікія Жары кулак падпаліў маемасьць старшыні Баршчоўскага сельсавету. Ад гэтага пажару пацярпела яшчэ 10 сялянскіх гаспадарак і страты ад пажару ацэнены ў 10 тысяч руб.

У пасёлку „Новы Мір", Перарастоўскага сельсавету, кулаком Лепленкавым быў зьбіты член сельсавету і член калгасу імя Калініна Сарачук за тое, што ён казаў сялянам аб неабходнасьці здачы хлеба каапэрацыі, што ў калгасе лепш жыць. У вёсцы Барэц кулакі сарвалі сход па хлебазагатоўках, а ў вёсцы Перадзелцы прыходзілася два разы праводзіць сход сялян для абмеркаваньня пляну хлебазагатовак.

У некаторых вёсках сельсаветы ня сочаць за акуратным выкананьнем загатоўчых пляноў. У вёсцы Паноўцы член сельсавету Кавалёў М. адкрыта выступіў супроць загатовак. Асобныя члены сельсавету сьвядома зьменшылі сабе заданьні і гэтым самым выклікалі незадаволеньне сялян.

На кулацкія спробы тэрору неабходна адказаць узмацненьнем працы па хлебазагатоўках. Неабходна павесьці сталую працу з беднатой вёскі. Таксама неабходна наладзіць паказальны працэс над кулакамі-тэрарыстымі.

В.

Трэба спыніць ажыятаж.

(Полацкая акруга).

Загатоўчая кампанія ў Полацкай акрузе ў разгары. Да пачатку кампаніі па ўсіх райёнах, сельсаветах сіламі партыйных, савецкіх, камсамольскіх і інш. арганізацый праведзена вялікая растлумачальная праца з дакладамі аб загатоўках і інш. У выніку бядняцка-серадняцкая частка насельніцтва жвава адгукнулася на заклік камуністычнай партыі—здаваць свае хлебныя лішкі выключна праз казённую [illegible] ў [illegible] райёнаў прыходзіць [illegible] аб чырвоных абозах. Здаюць хлеб калгасы, здаюць бедныкі і сераднякі. Усе яны зацікаўлены ў зьнішчэньні спэкуляцыі хлебам.

Але на вялікі жаль у праводзімай кампаніі, якая ў асноўным праходзіць пасьпяхова, маецца шэраг недахопаў, якія патрабуюць хуткага зьнішчэньня. Загатоўчыя арганізацыі не маглі своечасова падрыхтавацца да сустрэчы чырвоных абозаў. У Лепельскім і Вульскім райёнах былі выпадкі, калі прыходзіць чырвоны абоз, каапэратары ня маюць вольнага памяшканьня. У выніку загатоўцы адмовіліся прыняць ад сялян бульбу, попыт на якую ў спажыўца вялізны.

Канкурэнцыя жае свае месца. Старшыня Каменскага Таварыства Лепельскага райёну, можна сказаць, «вораг» усякай канкурэнцыі. Вось чаму гэты старшыня арганізаваў г. зв. „сакрэтны абоз з хлебам". Арганізаваў так, што іншыя арганізацыі зусім ня ведалі пра такі абоз. Сярод некаторых загатоўцаў існуюць рвацкія настроі. Гэтая хвароба вельмі небясьпечная, шкодная для плянаў загатоўчай кампаніі.

Некаторыя ўпаўнаважаныя па загатоўках зрывалі кампанію (Расонскі райён), не правялі сярод насельніцтва, асабліва беднаты растлумачальнай працы. Кулак Раманоўскі (Круцікеўскі сельсавет) мае падпольную гарбарню, займаецца самагоначарэньнем, індывідуальна абкладзен у 331 руб. Ён, „дыпляматычна" карыстаючыся слабасьцю нізавых працаўнікоў, ашукаў на некалькі пудоў загатавіцеляў.

Алёша Смаленскі.

Загатавіцельныя „ўхабы".

(Талочынскі раён, Аршаншчына).

— Сёньня мы самі бачылі,—кажа т. Дзяніcёнак на пленуме Талочынскага РВК,—як чырвоны абоз з хлебам вельмі доўга стаяў каля здатачнага пункту і чакаў пакуль вяліся пошукі загадчыка пунктам, які ў гэты час недзе адсутнічаў. Гэта вельмі ня добра, калі сяляне доўга чакаюць здачы хлеба. Патрэбна наладзіць прыёмку хлеба так, каб селяніну ня прыходзілася стаяць перад пунктам.

— Кулакі хлеб не здаюць адразу, а чакаюць пакуль гэта зробіць беднота, —кажа тав. Трупчанка.—Яны тады маюць магчымасьць менш здаваць хлеба, бо беднота, ня глезячы на тое, што ня мае лішкаў, здае дзяржаве пуд ці другі. Кулак гэтага і чакае. Беднота за яго хлеб здае, а нашы вясковыя камісіі не накладваюць на кулакоў, не даюць ім норму, а таксама выносяць на сходку з прапановай „хто колькі можа здаць". Вось тады беднота і ашукваецца кулакамі.

Райён выканаў толькі 20 проц. заданьня, кажа старшыня АВК т. Хандогі. Калі гэта так, дык насельніцтва —кулакі і заможныя гаспадаркі—здалі яшчэ зусім мала, бо здавалі свае лішкі калгасы і савгасы, хлеб якіх таксама ўваходзіць у гэту лічбу. У райёне не вядзецца сталага вучоту працы па хлебазагатоўках і ніхто ня сочыць, як ідзе праца ў сельсаветах. Зразумела, што пры такой пастаноўцы працы, якую мы маем у Талочынскім райёне, кулак будзе захоўвацца за плечы бедняка. Патрэбен рашучы пералом, праверка працы сельсаветаў, большы націск на кулака і сталы вучот усёй працы па хлебазагатоўках. Асабліва патрэбна дабіцца, каб своечасова і абавязкова даваліся зьвесткі. Вінаватых у бязьдзейнасьці патрэбна прыцягваць да адказнасьці.

— Загатоўкі ў нас ідуць так,— апавядае старшыня камуны Тарасевіч: —Прывязуць сяляне, дык хлеб ад іх прымуць, а не прывязуць, добра. Загатавіцеляў гэта н бо яны вельмі спадзяюцца веты. А здаюць вельмі час ныя сяляне ня жыта, а адз абы здаць, абы адыграцца. працу ўзяцца добра і падц калі так і далей будзе ісь дык заданьне Талочынскі ра канае.

На нашаму раёну маец даўгоў за сялянствам: ня сельгаспадатку, самаабклад хоўцы і ссудах каля 10.00 трэбна хутка праверыць х дзяржаве і разам з правядзе базагатавіцельнай кампаніі даўгі.

Яшчэ зусім не наладжана тва па загатоўках. Вельмі снакоенасьці ў нашай праці слаба праводзіцца і растлу праца. Сяляне ня ведаюць калі ў яго ня хопіць хлеб будзе мець магчымасьць атр ў каапэрацыі.

У вёсцы Зарэчча ў ка разьмеркаваньню нормы т можнікі і яны ўсклалі ўвес на беднату, а сваіх заможні кранулі як належыць. Бедна кага сельсавету, пад кір актывістых, арганізавала сам ны абоз і здала свае лішкі Патрэбны вельмі рашучы пе праца па хлебазагатоўках р ся, як належыць.

Кулака не патрэбна прыма воны абоз, бо ён прывязе хлеб і мала, а потым патра каапэрацыя дала яму ўсяго, патрэбна з дэфіцытных тавар мас на гэта грошы. Ёсьць прыватнік, але ён купляе хл мі, няпрыкметна і крымае д у сваіх знаёмых.

Збор закантрактаваных культ ідзе дрэнна.

(Гутарка з намесьнікам Наркома Гандлю т. Абрамсо

Тав. Абрамсон толькі ўчора вярнуўся з Бабруйшчыны і ў гутарцы з нашым супрацоўнікам азнаёміў з ходам загатоўчай кампаніі ў Бабруйскай акрузе.

За апошні час у Бабруйскай акрузе загатоўка хлеба разгарнулася досыць шырока. Да 20 кастрычніка месячнае заданьне Бабруйшчына выканала на 56,7 проц. Зараз ідзе значны націск на кулацкія гаспадаркі, якія затрымоўваюць здачу хлеба і тым самым зрываюць выкананьне загатоўчага пляну.

Кепска разгорнута праца каапэрацыі ў галіне хлебазагатовак, яшчэ горш справа з прэміраваньнем здатчыкаў хлеба. З-за фармальных меркаваньняў прамтавары ляжаць на складах Акрсаюзу і Райаддзяленьняў і толькі ў апошнія дні частка іх накіравана ў нізоўку для ўзмацненьня загатовак. На мясцох зусім ня ўрэгулявана забясьпечаньне прамтаварамі з хлебазагатоўкамі, вельмі кепска стаіць справа з кантрактацыяй. Сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі паўтарае памылкі леташняга году, яна ўсю ўвагу зьвярнула на загатоўкі і зусім забыла аб зборы закантрактаваных культур. Калі плян загатовак даведзены да вёскі, дык пляны кантрактацыі не даведзены нават да сельсавету, сельсаве ня ведаюць, хто з сялян кант і якія культуры кантрактава.

Зараз па раёнах разгортвае ца на давядзеньню пляну бульбы як да асобных вёсак, асобных кулацкіх гаспадарак. шэраг пастаноў асобных сход ніцка-серадняцкага сялянства рэньні чырвоных абозаў буль рыхтоўка эшалёну бульбы, Слуцку накіроўваецца ў пэн добра.

Трэба зьвярнуць самую с ўвагу на арганізацыю ссыпн таў каля чыгуначных станцы меных вязанак для пакрыцьц бы, бо магчымы замаразкі, а загатоўцы бульбы прыдзецца в і ўзімку.

На мясцох ня зроблена пі білізацыі сіл для таго, каб ся прыходзілася стаяць, чакаючы, ад іх прымуць бульбу, трэба г ву наладзіць.

Ёсьць усе падставы меркав пры непаслабленьні ўзятага т гатовак плян па загатоўцы будзе выканан.

Новыя „откровения" Зарэцкага*)

Зарэцкаму выступаць не ўпяршыню. Зарэцкі панадзіўся нахабна і неапраўдана „біць" сваіх супрацоўнікаў, суб'ектыўна „шчырымі" заявамі страхуючы сябе ў той момант, калі якраз тэарэтычна ўгрунтоўвае свае літаратурныя і палітычныя ўхілы. Зрабілася яно і гэтага разу таксама па гэтым мэтадзе.

На дакладзе „Аб шляхах разьвіцьця пролетарскае літаратуры на Беларусі" Зарэцкі выступае з трохі нясьмелаю, але выразна праграмнаю прамоваю, і палітычнаю прамоваю. Ён сказаў: „Я выступаў на зьезьдзе Бел. АПП'а супроць тэорыі самабытнасьці (?!— Р. М.), але ніхто з Беларапаўцаў мяне не падтрымаў"... Потым, пераходзячы да стылю пралетарскае літаратуры, ён гаворыць, што стылем пралетарскае літаратуры павінен стаць рамантычны стыль, як стыль, які найбольш вынукляе моцныя асобы нашага часу, які моцнаянальна заражае чытача і высоўвае стымул для барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва. І таму, кажа ён, ня трэба нам захапляцца рэалізмам, бо рэалізм цягне да натуралізму, бо ён фатаграфуе жыцьцёвыя факты, а не падае іх у мастацкай гіпэрбалічнасьці. І, нарэшце, Зарэцкі перашуча заявіў, што чуткі пра закуліснае арганізаваньне ім новае арганізацыі і адколаў ад існуючых аб'яднаньняў беспадстаўныя, але-ж ён лічыць, што тыя творчыя мэтады і мэтады змаганьня за пралетарскую літаратуру, за новы, пралетарскі стыль павінны быць зьменены.

Расшыфруем зашыфраваныя месцы і сарвём загадкавыя (на першы погляд) апонкі з заяў і „творчых" мэтадаў Зарэцкага. Пачнем з заяў.

Можа Зарэцкаму думаецца, што ў удзельнікаў І зьезду Бел. АПП памяць так саслабла, што яны, не спадзяючыся на яе, паверацъ нахабнай заяве яго, Зарэцкага? Можа. Шмат што можа думацца, асабліва калі ўсе спробы барацьбы супроць генэральнае лініі партыі і мастацкай літаратуры біты, калі можа не застацца ўжо больш ніякага выйсьця, як толькі думаць ды безнадзейна спадзявацца. Дык усё-ж такі, не пакладаючыся на памяць удзельнікаў І зьезду, як не пакладаемся на памяць і Зарэцкага, бязумоўна, разгорнем стэнаграму зьезду і паслухаем, што там казаў Зарэцкі па пытаньні тэорыі нацыянальнае самабытнасьці. А вось:

«Расейская культура і расейская літаратура ў частцы ў тым выглядзе, у якім яна знаходзіцца, бязумоўна, мае больш магчымасьцяў для ідэолёгічных вывіхаў, чым літаратура Беларусі, Украіны і г. д.» Далей, гаворачы аб перакладах з расейскай мовы на беларускую, а фактычна працягваючы спрэчкі па тэатральнай дыскусіі, ён кажа: «Хіба п'еса расейская, рэвалюцыйная, добрая п'еса (у яго чамусьці п'еса зьвязана з літаратурай, а ня з тэатрам—Р. М.) ня ёсьць уклад у беларускую пролетарскую літаратуру?»... пытаецца ён і адказвае: „Гэта ёсьць уклад у пралетарскую літаратуру наогул, але не ў беларускую... І расейскія п'есы і расейскія творы даюць нейкую карысьць нам, але расейская п'еса ніколі ня стане беларускай, хаця-б яна сто раз перакладалася па беларускую мову. Мы ніколі не дапусьцім падмены беларускае літаратуры, пралетарскае па зьместу і нацыянальнае па форме перакладамі з расейскай ці якой угодна іншай літаратуры».

Усе гэтыя разважаньні кажуць самі за сябе. І сапраўды, таварышы, што гэта за ўважваньне на вазе магчымасьцяў аб большай падпарадкаванасьці ідэолёгічным вывіхам расейскае літаратуры і што гэта, нарэшце, за частае агульнае паўтараньне „расейская, беларуская". У кожнай нацыі ёсьць дзьве нацыі, у кожнай культуры ёсьць дзьве культуры, казаў таварыш Ленін. Ёсьць шмат твораў беларускае літаратуры (і Зарэцкага ў тым ліку), якія ні ў якім разе не зьяўляецца ўкладам у беларускую пралетарскую літаратуру, а тым самым і ў пралетарскую літаратуру Савецкага Саюзу. Усе гэтыя развагі аб перакладах і п'есах, усё супроцьстаўленьне расейскай літаратуры ўцалку культуры беларускае,—сама гэта пастаноўка пытаньня—хіба ня сьведчыць яна аб нацыянал-дэмакратычнай махровасьці Зарэцкага, а не аб выступленьні супроць тэорыі самабытнасьці.

Заява № 2. „Ходзяць чуткі, быццам-бы я ваду закулісную работу на новай арганізацыі, на адколу некага ад некага. Няпраўда". Бачыце, як гэта лёгка, сказаў адно слова „Няпраўда" і ўсё тут. Але як гаворыцца: «Язык мой, враг мой». Язык падкузьміў Зарэцкага яшчэ на зьезьдзе БелАПП, дзе ён сказаў аб уваходзе Маладняка ў ВАПП: «Сёньня, таварышы маладнякоўцы, будзе канчаткова афармлена ваша арганізацыя ў сэкцыю ВАПП. Мне хацелася-б што-небудзь сказаць вам на гэтаму поваду (бачыце, як нясьмела пачынаецца—Р. М.). Я ня ведаю, ці дасьць вам гэта канкрэтныя вынікі, ці можа быць гэта застанецца чыста фармальным зьявішчам. Пакуль што я не бяруся ні вітаць вас, ні фігуральна кажучы, выказваць вам спачуваньні". Бачыце, якая добрая парада пісьменьніка - комуніста Зарэцкага пры ўсіх напружаных намаганьнях беларускіх пралетарскіх пісьменнікаў да аб'яднаньня ў адно ўсіх літаратурных атрадаў пралетарскае літаратуры ўсяго Савецкага Саюзу. Якая агідная двуліцасьць, які гандаль словамі: я супроць тэорыі самабытнасьці, але я і супроць аб'яднаньня пралетарскіх літаратурных сіл, перш заява, страхаваньне ад абвінавачваньняў, а потым працягваньне варожых ідэй і ўгрунтоўваньне сваіх нацыянал-дэмакратычных (агульна беларускае супроць агульна расейскага) тэорый. Вось як Зарэцкі на зьезьдзе Бел.АПП выступаў «супроць» тэорыі самабытнасьці і як яго, бязумоўна, белапаўцы ня толькі не падтрымалі, а рашуча ўдарылі па ім. Пра апошняе (калі гэта ён мае на ўвазе, кажучы што яго не падтрымалі) ён кажа праўду, саграшылі белапаўцы,—ударылі па Зарэцкаму.

Застрахаваўшы сябе (нібыта) заявамі, Зарэцкі з закасанымі рукавамі падыходзіць да справы: стылем пралетарскае літаратуры павінен стаць рамантычны стыль, прыёмам якога ўладаючы, пралетарская літаратура заразіць чытача эмацыянальна, у прыватнасьці, паказам моцных гэраічных асоб і тым створыць стымул для барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва. Далей ісьці ўжо няма куды і так заехалі, т. Зарэцкі, што трудна вярнуцца назад. Цяпер па сутнасьці рамантычнага стылю. Што такое рамантызм? Рамантызм, як устанаўляюць марксысты - літаратуразнаўцы, ёсьць мэтад адпіхваньня ад рэчаіснасьці, ад сапраўднасьці шляхам узьвядзеньня ўяўленьняў аб сьвеце ў некаторы ідэал, у некаторы абсалют. Пазнаючы сьвет, мастак-рамантык выходзіць ня з існуючага, а з павіннага, у той час, як марксызм кажа, што мы павінны выходзіць не з павіннага, а з існуючага і выходзячы з гэтага тлумачыць ужо павіннае. Персанажы мастака-рамантыка рэальна ня існуюць. Яны людзі вырваныя з рэальнасьці і ўзьведзеныя на п'едэстал абсалютнага ідэалу. Адным словам кажучы, мастак-рамантык адкідае рэальнае жыцьцё і ад таго яго гэрої—людзі нейкія «не от мира сего», людзі недасяжна ідэальныя і ад таго хадульныя, усе зробленыя на адзін капыл па ступені свае ідэальнае прыстойнасьці; яны ідэальна-шаблённыя гэрої, якія ўжо адным тым, што яны ідэальныя абсалюты, ва ўсіх творах застаюцца аднакімі, хоць і вар'іраванымі на ўсе лады, у залежнасьці ад выконваньня тае ці іншае ролі. Праілюструем гэта на творах хоць-бы Зарэцкага, паглядзімо, якіх моцных асоб дае ён нам.

«Кветка пажоўклая» — камуністка Гарнова, дачка памешчыка, што «здавалася восенскай кветкай, якая жоўкне сярод быльля сухога і яшчэ песьціць погляд сваім астатнім сумным харастаком».

«Голы зьвер»—Яроцкі, яго жыцьцёвы закон: „У жыцьці трэба йграць, трэба змагацца. Каб жыць—трэба быць спрытным, разумным, трэба рваць з-пад зубоў у людзей ласы кавалак і спажываць яго пад візг, скавытаньне гэтых абдураных дурняў".

„Сьцежкі-дарожкі"... Моцныя тыпы: Карла Іванавіч Шэмпель і Раіса, зноўжа дачка памешчыка і, наадварот, слабыя, хоць і дадатныя быццам-бы тыпы: Лясьніцкі, Ніна, Андрэй.

У апавяданьні „Ворагі"—моцны тып дачка памешчыка, слабы — работнік ЧК Гуторскі.

І так у кожным творы Зарэцкага: моцныя тыпы з сацыяльна-варожага лягеру супроцьставяцца слабым інтэлігентным тыпам з пралетарскага лягеру. Вось асаблівасьці рамантызму Зарэцкага.

Цыган свайго каня за плот валіць, а ўсё хваліць... Гэтак і з Зарэцкім. Хоць жыцьцё ўпарта адхіляе яго творчы мэтад, усё-ж такі ён набіваецца, лезе з ім сьляпіцаю ў вочы. Навошта спатрэбілася Зарэцкаму такая пазольная папулярызацыя рамантычнага стылю, як быццам-бы стылю пралетарскае літаратуры?

На гэта мы адкажам потым, а перад тым зьвернем увагу чытача на назвы, якія дае сваім творам Зарэцкі. „У віры жыцьця", „Пад сонцам", „Пела вясна", „Голы зьвер", „Сьцежкі-дарожкі". Усе гэтыя назвы зьяўляюцца характэрнымі прыкладамі адпіхваньня ад жыцьця, ад рэальнасьці, ад рэчаіснасьці. Нават больш, Зарэцкі ў сваіх творах адхіляецца ў бок сымбалізму, у бок містыцызму. Яго рамантычная характэрнасьць—перастаноўкі слоў, як: „быльля сухога", „чырванню сьвежай" і г. д., пераходзіць да такога прыёму азначэньня, як „нейкая", „некуды", „чамусьці», „нейдзе", што ўжытае ў неабмежаванай колькасьці ў творы тым самым набывае выразна адмоўную сымбаліка - містычную якасьць. Каб падмацаваць сваё гэтае сьцьверджаньне, досыць толькі падаць незаўважаны ніводным з рэцэнзэнтаў «Сьцежак-Дарожак» такі літаратурны факт: Лясьніцкі з Раісаю пушчаюць на Дняпровянкі ў купальскую ноч; Раіса загадвае на вядомага ей чалавека (на Карла Іванавіча Шэмпеля, з якім была яна ў фізычнай сувязі); сьвечкі на вянках тухнуць адначасова. Варажба спраўджваецца: Раіса гіне разам з Карлам Іванавічам Шэмпелем, сваім дзядзькам-бандытам, выпіўшы з аднае шклянкі цыяністага калія. Варажба спраўджваецца і рамантызм Зарэцкага перарастае ў містыцызм. Мы гэтым ня хочам сказаць, што Зарэцкі суб'ектыўна верыць у варажбу, мы хочам спыніцца на другім, а менавіта, на яго рамантызьме ў сувязі з рамантам „Крывічы", які пачаў быў друкавацца ў „Полымі".

Аддаўшыся над уладу прыёмам рамантычнага стылю і ідучы ўразрэз жыцьцю, што даведзена намі на сьціслым аналізе яго творчасьці. Зарэцкі накіроўваецца да серадняпяковага аналізу і ўкрадкі выцягае з яго запыленую зброю французкіх буржуазных рамантыкаў. Да чаго-ж даваёўваецца Зарэцкі гэтаю зброяю?

Адпіхаючыся ад жыцьця праз падачу сваіх «моцных», але варожых нам тыпаў, ён аддальваецца ад жыцьця і шукае сабе ідэальных абсалютаў у архаічным мінулым. „Крывічы"—квінтэсэнцыя творчасьці Зарэцкага. «Крывічы»—кульмінацыйны пункт у яго „разьвіцьці". На прыкладзе «Крывічоў» мы бачым, як, аддальваючыся ў мінулае, Зарэцкі знаходзіць элемэнты „залатога веку" Беларусі, і як іх узводзіць на п'едэстал ідэальнага абсалюту.

На першым зьезьдзе БелАПП, „вітаючы" зьезд, Зарэцкі сказаў: «І вось, калі вы сустракаецеся часам з запраўскім шустрым інтэрнацыяналістым, вы падыходзьце да яго, таварышы, асьцярожна, бо можа быць, паскробшы яго, мы знойдзем пад яго надворным аблічам і нешта іншае. А мы сказалі-б, падыходзячы да Зарэцкага: «Паскрабеце такога вось «змагара» рускую пралетарскую літарат яго пасьпецца серадняпяковая

Цяпер вернемся крыху ўзад, шага апошняга запытаньня, на Зарэцкаму спатрэбілася даводзі летарскаць рамантычнага с вось навошта. Усе яго доказы юцца нічым іншым, як чыста тыўнымі прыёмамі замазваньня тыўнае сутнасьці. Расшыфруем: мантычны стыль ёсьць і павіне стылем пралетарскае літаратур значыць, я, Зарэцкі, ёсьць пр ські пісьменьнік, а раз я пра пісьменьнік, дык якія могуць мяне ўхілы ад лініі партыі ў цыянал-дэмакратызму ў літар інш. І калі-б гэта ўдалося яму выя ілюзіі), тады-б ён, Зарэцкі водзячы ў літаратуре і публіц і ва ўсёй сваёй практычнай ідэі і тэорыі сваіх, варожых «моцных» літаратурных тыпаў война і беспакарана рабіў бы далакопскую работу супроць б кае пралетарскае літаратуры. чым сутнасьць яго выступлень літаратурным дыспуце, якое в вельмі нагадвае яго выступлен партыйных сходах. «Я не я: што хоча нам давесьці Зарэцкі заявамі і рознымі выступленьня якіх ніколі і ідзе не адмаўля сваіх ухілаў, што закладзены ў це яго творчага быцьця. А ён ц ца і прысягае ўсё-ж-такі сваёю баю пралетарыяту (якая ўпар зойлівасьць! — яна вельмі н жыцьцёвы закон Віктара Яроц „Голага Зьвера").

На дыспуце пад канец свае вы ён сказаў літаральна нас «Разьвіваецца будуць ня тыя, х сягаюць імем пралетарыяту БелАПП, якая рэзка суб'ектыў рожасьць), а тыя, хто сапраўд служыць. Ці ня вы гэта, Зарэ жыцце пралетарыяту, вы? Не! В жыцце яму, як той далакоп, я магільшчык, капаючы яму. Не це, бо самі ўпадзеце ў яе, ум даеце, заўважце гэта.

Р. МУРАШ.

*) Замест прамовы на літаратурным дыспуце ў Доме Асьветы.

Уцягненьне вясковай беднаты у барацьбу з бюракратызмам.

(Аб дзейнасьці камісій РСІ пры РВК і сельсаветах).

сіі ня ўсюды арганізаваны.

і партканфэрэнцыя ЎсеКП(б), нада-асаблівае значэньне барацьбе з бю-тызмам. адзначыла ў сваей рэзалю-а дакладу ЦКК РСІ аб неабход-і арганізацыі пры валасных (рай-х) і сельскіх саветах Камісій РСІ; ізацыя іх і нагляданьне за іх пра-складзена на мясцовыя партканмі-і парт'ячэйкі супольна з адпавед-выканкомамі і саветамі.

падставе дырэктывы ХУІ партканцыі ЦВК БССР было зацьверджана бязнае палажэньне аб Камісіях РСІ РВК і сельсаветах (прат. № 71, ад 1929 г.).

іншым, яшчэ да гэтага часу ў х райёнах і буйнейшых сельсаветах ганізаваны камісіі (э абсьледуемых лявіцкі райён, Менскае акругі, Ува-кі райён, Гомельскай акругі і інш.).

некаторых райёнах хоць камісіі і ізаваны, але-ж яны існуюць бяз сы-тычнага кіраўніцтва з боку РВК і П(б)Б і прадастаўлены самім сабе. камісіі вельмі часта не змагі-ць дзейнасьць, арганізаваць вакол актыўнасьць масы, у выніку—або ць на паперы, або зусім распаліся. явіцкі райён, Менскай акругі, Буда-лёўскі райён, Гомельскай акругі, ускі райён і інш.). Райкампарты ня нават ведаюць, што гэта за арга-ы.

руговыя выканкомы і іх працаўнікі выездах у вёскі пытаньнем інструк-ньня камісій РСІ не займаюцца, так-і на пленумах.

Сыстэматычна кіраваць.

аданьне камісій РСІ ў некаторых ах і сельсаветах адбылося дзякуючы ку з боку органаў КК РСІ. Аднак, се акруговым КК РСІ ўжылі належ-рокі да арганізацыі гэтых камісій. а памятаць, што органы КК РСІ па-ы дапамагаць камісіям у працы, пэ-тычна інструктаваць іх, даваць ім ыя заданьні, а сыстэматычнае кіраў-а і нагляд за працай павінны ля-на адпаведных выканкомах і сель-ах.

якомы і парт'ячэйкі разам з кіраў-ам працай камісій павінны папуля-ваць іх працу

Наладзіць вучот працы.

ейнасьць тых камісій РСІ, якія ш-менш працавалі, паказвае, што зусім апраўдалі сябе, накіроўваюц-а сваю працу на выкарчоўваньне з ога савецкага апарату рознага роду чак і злачынстваў. Папершае, усе камісіі (райённыя і сельсавецкія), працуюць, прымаюць цэлы шэраг аў ад працоўнага насельніцтва, га-ых заметак, рассьледуюць іх і ўжы-ць тыя ці іншыя меры ў адносінах іноўных. Напрыклад, была скарга се-а, што прараб Лесбелу зьняў бед-, а паставіў на яго месца заможніка. га было рассьледавана, факты пацьвер-зіліся. Заможнага зьнялі, а бедняка вілі, і прараба Лесбелу зьнялі з пра-Парычы, Бабруйскай акругі).

едахопам у гэтай частцы працы ка-зьяўляецца адсутнасьць вучоту па-ючых скаргаў і газэтных заметак.

ольш цьвёрдасьці ў працы.

ногія пытаньні разглядканы камісіямі па даручэньню Акр. КК-РСІ. Райён-і сельсавецкія камісіі ў сваю чаргу ць адпаведны матар'ял Акруговым і зьвяртаюцца да іх за дапамогаю. Капаткевіцкая Райкамісія РСІ (Ма-акр.) паведаміла Мазырскую Акр. аб тым, што няправільна былі адноў-ў Белпэдтэхнікуме 2 студэнткі—яркі, якія настроены антысавецкі і рышлося выключыць паўтора. Камі-РСІ Чырвона-Слабодзкага РВК (Бабр. дала добрь матар'ял, прапрацавала ньне аб няправільным скарыстаньні па каапэраваньню беднаты і за ўленьне клясавай лініі запрапана-зьняць з працы з аддачаю пад суд шыні крэдытнага таварыства. Паколь-ВК не згаджаўся з гэтым, ка-а перанесла гэта пытаньне ў РС, і там пастанова камі-РСІ была пацьверджана. Іменна такім ам, з прынцыповай пастаноўкай пы-ня павінны працаваць камісіі РСІ. ўда, зацьвярджае ўсе пастановы ка-і РВК і пэрсанальна старшыня, але ў торых важных пытаньнях, як у да-выпадку, калі камісія не згаджаецца цьшова па таму ці іншаму пытань-з думкаю РВК, трэба, каб камісіі выявілі настойлівасьць і ініцыятыву раносілі пытаньне ў акр. РСІ.

ываюць, бязумоўна, і процілеглыя ты, калі адмяняюцца пастановы камі-сіі, напрыклад, пастанова Лёзьненскай РСІ (Віцебская акр.) аб зьняцьці з працы сэкратара пам. пракурора, але-ж і такія выпадкі (яны, праўда, рэдкія) не павінны мець уплыву на прапаздольнасьць камісій, а наадварот.

Прыцягваць шырокія масы працоўных.

Усё-ж асноўным недахопам у працы камісій РСІ зьяўляецца адсутнасьць шырокай аворы на батрацка-бядняцкія масы і мабілізацыі іх увагі да працы камісій РСІ па выяўленьню рознага роду балячак і недахопаў у нізавым савецкім апараце.

Ёсьць такія ноткі ў мясцовых працаўнікоў, што надта шырока ўцягваць масы ня прыходзіцца, бо нельга і арганізацыйна ахапіць, і ўсёроўна з многіх членаў камісіі мала карысьці. Усе гэтыя і ім падобныя матывы павінны быць адхілены, як такія, што вынікаюць з неразуменьня задач партыі і савецкай улады. У барацьбу з бюракратызмам, у справу палепшаньня кантролю за дзейнасьцю савецкага апарату трэба ўцягнуць шырокія працоўныя масы—у гэтым асноўная задача. Камісія РСІ Ляднянскага РВК, якая складаецца, галоўным чынам, з асоб, якія служаць у сучасны момант і займаюць адпаведныя ў раёне пасады (старшыня камісіі—заг. АПА РК, члены: інспэктар раёну, загалчык вардому, старшыня рэвкамісіі—настаўнік і інш.). Гэткі склад не адпавядае задачам камісіі. Гэтыя т. т., як больш падрыхтаваныя, павінны быць арганізатарамі тых бядняцкіх і батрацкіх мас, якія яны павінны ўцягнуць у гэту справу. Абмежаванца толькі сваёю працаю (а гэтыя т. т. усе загружаны) будзе няправільна і ня дасьць карысьці. Трэба справу паставіць такім чынам, каб усе, што далі згоду працаваць, атрымалі тую ці іншую працу, і каб больш письменныя т. т. дапамагалі ім. У практыцы працы сельскіх камісій ёсьць таксама адмоўнае тое, што з трох членаў камісіі, галоўным чынам, працуе старшыня камісіі. Такі „міліцэйскі" падыход, бязумоўна, павінен быць зьнічан у дзейнасьці камісіі.

Ёсьць яшчэ такія настроі, што калі прымаць усіх жадаючых працаваць у камісіях, дык увойдуць такія элементы, якія змогуць скарыстаць годнасьць члена камісіі РСІ. Гэта няправільна, таму што ў камісіі могуць быць толькі працоўныя. Калі-ж будуць выпадкі скарыстоўваньня годнасьці члена камісіі ў асабістых мэтах, дык на такія элементы трэба ўзьдзейнічаць такім-жа шляхам, як і ў любой арганізацыі—шляхам грамадзкага ўпливу на сходзе камісіі, ці выключэньня са складу камісіі.

Вырашаць не на аснове чутак.

Акрамя паказанага асноўнага недахопу ў працы камісіі, назіраюцца памылкі ў мэтадах працы. Так, досыць часта камісіі ня зусім дасканала правяраюць факты, часта спасылаюцца на так званыя „па маючыхся зьвестках", а чыіх зьвестках, ці правільны гэтыя зьвесткі—камісіі не правяраюць. Трэба, каб камісіі дасканала праверылі факты, дакументы і толькі пасьля гэтага выносілі пастановы.

Ёсьць выпадкі, калі факты, паказаныя ў скарзе ці заметцы, пацьвярджаюцца, і камісіі гэтым абмяжоўваюцца—„канстатаваньнем факту" (Узьдзенская камісія, Менскай акругі). Гэтага мала. Трэба на толькі канстатаваць факт, але прымаць меры ўзьдзейнічаньня, выправіць дапушчаную памылку.

Пры расьсьледваньні кожнага пытаньня, а тым больш пры абсьледваньні тэй ці іншай установы, камісія павінна трымаць сувязь з грамадзкімі арганізацыямі гэтай установы, са ўсёй масай рабочых і служачых гэтай установы, інфармаваць іх аб мэтах і выніках абсьледваньня, атрымліваць ад іх пэўны матар'ял і дапамогу.

Увесьці плянавасьць.

Плян працы маюць вельмі нямногія камісіі. Бязумоўна, што асноўная задача камісіі. РСІ—гэта хуткае рассьледваньне і рэагаваньне на скаргі, заявы і заметкі працоўнага насельніцтва, рашучае зьнішчэньне хібаў і недахопаў у савецкім апараце, паказаных у гэтых скаргах. Але-ж пэўны час працы камісіі павінны аддаваць плянавым пытаньням, павінны загадзя намеціць сабе пытаньні для прапрацоўкі, бо інакш будзе раскідванасьць—праца будзе ісьці ад выпадку да выпадку.

Пры складаньні плянаў трэба выходзіць з такіх момантаў: браць для поўнага абсьледваньня дзейнасьці тую ці іншую ўстанову тады, калі ёсьць пэўны матар'ял ці якія-небудзь паказальнікі (скажам—шмат скаргаў аб дрэннай працы гэтай установы). Лепш уключаць у плян працы паасобныя пытаньні і часткі дзейнасьці тэй ці іншай установы; напрыклад, па каапэрацыі могуць быць такія тэмы: а) як пастаўлена абслугоўваньне спажыўца, б) парадак і разьмеркаваньне дэфіцытных тавараў, в) фонды каапэраваньня беднаты і г. д. Наогул-жа гэтыя паасобныя тэмы павінны заўсёды мець на ўвазе, як тая ці іншая ўстанова абслугоўвае наведвальнікаў і тыя групы працоўных, якія яна прызначана абслугоўваць, каб ва ўсёй гэтай працы не скрыўлялася клясавая лінія, каб у першую чаргу была забясьпечана сялянская беднота, батрацтва; мець на ўвазе праверку выкананьня законаў савецкай улады.

Усякаму вядома, што ёсьць шэраг добрых законаў, якія накіраваны на тое, каб забясьпечыць працоўнаму насельніцтву лепшыя ўмовы працы, але-ж яны скажаюцца на месцы, не ажыцьцяўляюцца так, як трэба, напрыклад: закон аб падняцьці ўраджайнасьці, практыка вучоту аб'ектаў абкладаньня, выкарыстоўваньне сродкаў ад самаабкладаньня, землеўпарадкаваньне і г. д. Падагулены такі матар'ял у маштабе раёну, акругі можа ў значнай меры палепшыць выкананьне законаў савецкай улады, а ў некаторых выпадках можа паўстаць пытаньне аб зьменах у тэй ці іншай частцы законаў; пакольки камісіі зьяўляюцца падначаленымі—у раёне—РВК і с.-с. прэзыдыуму с-с, то іх абавязак таксама сачыць за праверкай выкананьня пастаноў РВК і сельсаветаў. Мы ведаем, што выносяцца пастановы РВК і сельсавету, але не правяраецца іх выкананьне.

Пры далейшым наладжваньні працы камісіі РСІ самі прэзыдыумы РВК і сельсавету (і парт. і праф. органы) павінны будуць даваць пэўныя заданьні камісіям РСІ для прапрацоўкі.

Прапрацоўваць і вывучаць свае задачы.

Апошняе пытаньне—гэта арганізацыйная работа камісій і папулярызацыя сваёй працы сярод працоўных.

Абсьледваньне дзейнасьці некаторых камісій паказала, што многія не разумеюць ні сваіх правоў, ні сваіх абавязкаў. Ёсьць пэўнае налажэньне, аб якім успамінаецца вышэй, дзе падрабязна паказана, як павінна праводзіцца праца. Гэта налажэньне ў некаторых камісіях нават не прапрацоўвалася—пагэтаму і выходзіць блытаніна. Трэба паставіць справу такім чынам, каб кожны член камісіі добра быў знаёмы з палажэньнем.

Потым выклікае недарэчнасьць пытаньне адносна арганізацыі бюро ці прэзыдыуму камісій. Аб гэтым хоць у палажэньні і не паказана, аднак, была разасланна спэцыяльная адносіна НК РСІ БССР, дзе рэкамэндавалася арганізацыя бюро ў тых камісіях, якія налічваюць шмат сяброў—для больш правільнай працы. Але ня трэба забываць, што выдзяленьне бюро ні ў якім разе не павінна пераносіць і ўсю працу на гэтае бюро, наадварот, цэнтр увагі працы застаецца на пленумах камісій, а бюро падрыхтоўваючы, арганізуючы орган.

Папулярызаваць сваю працу.

Пакольки існаваньне камісій РСІ ў раёнах і сельсаветах яшчэ не ўсяму працоўнаму сялянству вядома, неабходна, каб камісіі шырока асьвятлялі сваю працу на сходах, у насьценгазэтах і агульным друку, выкарыстоўвалі-б усякі для гэтага выпадак ня толькі пры абсьледваньні і расьследваньні „пытаньняў, але і на масавых сходах, што склікаюцца ў раёнах і сельсаветах па іншых пытаньнях.

Дзеля большай папулярызацыі работы неабходна, каб камісіі правільна наладзілі прыём скаргаў і заяў. Вывешваньне адпаведных скрынак, вызначэньне дэжурства членаў камісіі ў найбольш адпаведны для працоўных час і г. д.

У гэтым лісьце не закранаецца цэлы шэраг момантаў, пакольки падрабязна яны вызначаны ў палажэньні ЦВК. Пагэтаму яшчэ раз трэба падкрэсьліць, каб члены камісіі былі падрабязна азнаёмлены з азначаным палажэньнем.

Акрамя гэтага, аб выніках выбарачнага абсьледаваньня камісій РСІ пры РВК і сельсаветах нядаўна прынята рэзалюцыя ЦКК РСІ, якая была апублікавана ў цэнтральным беларускім друку. (Гл. „Сав. Бел." за 1929 г.).

Усе гэтыя мерапрыёмствы павінны паглыбіць працу камісій РСІ ў напрамку зжываньня недахопаў у нізавым савецкім апараце і барацьбы з бюракратызмам, бо „бюракратычныя скажэньні дзяржаўнага апарату ў шэрагу выпадкаў становяцца выказваньнем напору на рабочую клясу кулацтва, гарадзкой буржуазіі і буржуазнай інтэлігенцыі" (з рэз. ХУІ партканфэрэнцыі).

Я. Пасюкевіч.

АБГАВАРВАЕМ ПРАЭКТ АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭНЬНЯЎ АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ У СССР*)

Праз разгортваньне работы ўсяго сельсавету, праз наладжваньне работы сэкцый і камісій уцягнем батрацка-бядняцка-серадняцкія масы ў работу па сацыялістычнай перабудове вёскі.

АБ ПРАЭКЦЕ АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭНЬНЯЎ ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

Разасланы для абгаварэньня на мясцох сярод шырокіх працоўных мас праэкт асноўных палажэньняў аб арганізацыі сельскіх саветаў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у асноўным адпавядае сучасным задачам, якія пастаўлены перад саветамі, рабочай клясай і нашай партыяй. У гэты праэкт наложаны рашэньні партыі і савецкае ўлады аб ажыўленьні сельсаветаў аб тым, каб яны сталі сапраўднымі кіраўнікамі гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцьця вёскі. Праэкт забясьпечвае за саветамі кіруючую ролю на ўцягненьню бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі ў пабудове і кіраўніцтве сацыялістычай дзяржавы і накіраваньні актыўнасьці гэтых мас на барацьбу са шкодніками сацыялізму—капіталістычнымі элемэнтамі вёскі. Усё гэта праходзіць чырвоную стужкай па ўсяму праэкту і знаходзіць свой адбітак у яго разьдзелах.

Згаджаючыся з увядзеньнем у дзеяньне па ўсёй СССР такога важнага адзінага законадаўчага акту, я толькі хачу спыніцца на арганізацыі сальскіх саветаў, гэта значыць—па першым арт. праэкту, які гаворыць наступнае: „Сельскія саветы ўтвараюцца ва ўсіх населішчах, прычым дробныя населішчы могуць аб'ядноваць адным сельсаветам. Аб'яднаньне населішчаў, якія налічваюць 300 і больш жыхароў, а таксама ўтварэньне сельсаветаў у населішчах, якія налічваюць менш 300 жыхароў,—дазваляецца ў парадку, устаноўленым законадаўствам Саюзных Рэспублік у адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі і з вучотам нацыянальнага складу насельніцтва. Разглядаючы дэталёва гэты артыкул і выходзячы з практыкі арганізацыі і працы сельсаветаў Магілеўшчыны і нават усяе БССР, прыходзіцца сказаць, што гэты артыкул да ўмоў БССР не падыходзіць, па-першае, таму, што ён унясе вялікую ломку ў рэарганізацыю сельсаветаў і, па-другое, выкліча большыя выдаткі на ўтрыманьне саветаў.

Каб ня быць галаслоўным, спынімся на сучасным становішчы саветаў, хоць-бы Магілеўскае акругі. Цяпер у Магілеўскай акрузе, ня лічачы местачковых саветаў, існуе 258 сельсаветаў; гэтыя саветы аб'ядноўваюць 4814 населішчаў, у сярэднім 18-19 населішчаў на сельсавет, з колькасьцю насельніцтва ў сярэднім на сельсавет 2789 чалавек. Радыус абслугоўваньня ў сярэднім—5-6 кілёмэтраў; праўда, ёсьць і такія сельсаветы, радыус якіх даходзіць да 10 кілёмэтраў, але-ж гэта адносіцца да хутарскага насельніцтва.

Аналізуючы працу сельскіх саветаў, трэба адзначыць, што сельскія саветы там, дзе падабраны добрыя працаўнікі, з працай па абслугоўваньню насельніцтва поўнасьцю спраўляцца: там працуюць камісіі, уцягнуут у працу камісій вясковы актыву, і скаргаў ад насельніцтва на кепскае абслугоўваньне іх няма. Выходзячы з гэтага, трэба прызнаць, што сучасная арганізацыя сельсаветаў для ўмоў Магілеўскае акругі і нават усяе БССР пры наданьні ім тых правоў, якія пазначаны ў праэкце асноўных палажэньняў, у поўнай меры адпавядае момантам набліжэньня саветаў да мас, уцягненьня іх у савецкае будаўніцтва і лепшага абслугоўваньня. Рэарганізацыя ж сельсаветаў па прынцыпу, наказанаму ў 1-м артыкуле, як і сказана вышэй, выклікае шмат грашовых затрат на ўтрыманьне саветаў.

Для большай яснасьці прывядём лімбы ўтрыманьня сельсаветаў. Усяго ў 1928-29 годзе па местачковых і сельскія саветы па Магілеўскай акрузе выдаткавана 248230 рублёў, або ў сярэднім 900 р. на сельсавет. Калі-ж утварыць сельсаветы ў кожным населішчы, лічачы на кожны сельсавет на 300 жыхароў, то ў Магілеўскай акрузе, пры 719653 чалавеках насельніцтва, павінна быць 2399 сельсаветаў, утрыманьне якіх будзе каштаваць акрузе 2159100 рублёў у год. Але маючы на ўвазе тое, што ёсьць вёскі, якія налічваюць да 1000 чалавек насельніцтва і адступаючы ад прынцыпу арганізацыі саветаў у 300 жыхароў і дапускаючы гэткую арганізацыю ў сярэднім у 500 жыхароў, будзе 1439 сельсаветаў, утрыманьне якіх будзе каштаваць акрузе 1295100 р. Відаць, якая каласальная сума будзе ісьці на ўтрыманьне сельсаветаў гэта ў той час, калі зараз астаўлена пытаньне аб большым укладаньні сродкаў у прамысловасьць і сельскую гаспадарку і максымальным скарачэньні адміністрацыйна-гаспадарч. выдаткаў. Праца-ж ад гэтага разбуйненьня наўрад ці палепшыцца. Як прыклад, магчыма прывесьці тыя сельсаветы, якія ў нас ёсьць з колькасьцю 100 двароў і 500 жыхароў,—Галіцка-Мышскі, Грудзінаўскі і інш., якія нічым не адрозьніваюцца ў абслугоўваньні насельніцтва ад іншых сельсаветаў, а ў некаторых галінах працуюць нават горш.

Таварыш Енукідзе ў сваім артыкуле піша, што „за вопросами финансового и бюджетного характера не следует теряць из виду политическую сторону дела"—з гэтым згадзіцца, бязумоўна, трэба, але-ж трэба ўлічваць і тое, што пры арганізацыі саветаў у 300 жыхараў пры той норме праэктаўніцтва, роля савету будзе абмяжоўвацца старшынёй і сэкратаром савету, бо савету, як гэткага, ня будзе—ён пры існуючых нормах праэктаўніцтва будзе складацца толькі з трох асоб, з якіх уся пяжкасьці працы будзе ляжаць на старшыні і сэкратару, і яны мімаволі будуць замяняць у цэлым сельсавет, а трэці член будзе лічыцца толькі на паперы, або будзе служыць за пасыльнага.

15 артыкул палажэньня прадугледжвае ўтварэньне самастойных бюджэтаў, на гэты шлях трэба стаць абавязкова, але зноў такі ў саветах ня з гэткай колькасьцю насельніцтва, як гаворыць першы артыкул, бо ў вёсцы ў 75 двароў пры 300-500 жыхарох бюджэт будзе вельмі маленькі, які будзе складацца толькі з адлічэньняў сродкаў ад сельска-гаспадарчага падатку, якога падчас ня будзе хапаць на ўтрыманьне сельскага савету, іншых жа крыніц прыбытковасьці ў нашай беларускай вёсцы бывае вельмі мала, а з гэтага, як вынік, сельсавет будзе жыць на датацыі, якая з раёну атрымліваецца не заўсёды акуратна нават і ў тыя сельсаветы, якія маюць зараз самастойныя бюджэты, у сувязі з чым яны з прычыны несваечасовага атрыманьня датацыі ня могуць выканаць тую ці іншую працу, зьвязаную з грашовымі выдаткамі. І іх роля, як самастойных распарадчыкаў крэдытаў, сьціраецца райвыканкомам. Мы гаворым, што нашы сельсаветы павінны быць гаспадарчымі, палітычнымі і культурнымі кіраўнікамі вёскі. Які ж будзе ён культурны кіраўнік вёскі, калі не ва ўсіх вёсках з насельніцтвам у 300 жыхароў ёсьць школа, а аб хаце-чытальні і гаварыць ня прыходзіцца. Сельсавет будзе культурным кіраўніком тады, калі будзе мець на што апіраца ў вёсцы, а гэткую падставу мы пакуль што маем ня ў кожнай вёсцы.

І апошняе, гэта кіраўніцтва сельсаветамі з боку РВК. Зараз пры існуючай сыстэме нашы РВК недастаткова кіруюць яшчэ працай сельсаветаў, асабліва мала жывога кіраўніцтва, і тым больш гэта кіраўніцтва будзе адсутнічаць, калі будуць сельсаветы з колькасьцю ў 300 жыхароў, бо тады на раён будзе прыходзіцца ў сярэднім па 90-100 сельсаветаў. Райвыканкомы пры ўсім жаданьні з гэтым кіраўніцтвам пры сучасным штаце ня справяцца.

Выходзячы з вышэйсказанага, мая прапанова—гэты адзіны законадаўчы акт на СССР увесьці ў дзеяньне абавязкова трэба, але на шлях разбуйненьня становіцца пакуль што рана—сельсаветы трэба пакінуць у такім выглядзе, у якім яны існуюць зараз, дабавіўшы ў апарат іх на аднаму платнаму працаўніку (дзелавода), гэта будзе каштаваць куды таней, чым утварэньне саветаў у кожным населішчы. Тады старшыня і сэкратар будуць мець больш магчымасьці заняцца масавай працай савету і абслугоўваньнем насельніцтва; акрамя гэтага, трэба найхутчэй правесьці ў жыцьцё пастанову ЦВК аб увядзеньні ў РВК пасады інструктара, які сваім удзелам у працы саветаў больш даваў бы і жывога кіраўніцтва. Зараз саветы тонуць у моры папер, а калі яны ад гэтага паперага патоку будуць разгружаны, то будуць мець больш вольнага часу, які ў іх пойдзе на сапраўднае ажыўленьне працы камісій пры сельсаветах, на сапраўднае абслугоўваньне батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, уцягненьне іх у актыўную працу саветаў і ў барацьбу з кулацка-непманскімі элемэнтамі вёскі.

Я. М. К.

*) Усе матэрыялы ў гэтым аддзеле друкуюцца ў парадку абгаварэньня.

Больш самастойнасьці сельсаветам.

э кожным годам праца сельсаветаў паляпшаецца. У працу саветаў з кожнымі перавыбарамі ўцягваюцца новыя бядняцка-серадняцкія пласты вёскі, якія практычным сваім удзелам дапамагаюць ажыцьцёвіць лёзунг партыі аб індустрыялізацыі і перабудовы на калектыўных падставах сельскае гаспадаркі; і гэтыя пласты прыходзяць да кіраўніцтва зусім падрыхтаванымі. Вось чаму ў новых палажэньнях аб саветах трэба апошнім даць больш самастойнасьці.

Так, я ведаю адзін сельсавет, гэта Азяранскі ў Рагачоўскім раёне, які ўжо больш трох год мае самастойны бюджэт, але гэта „самастойнасьць" заключаецца толькі ў тым, што сельсавет складае сьмету прыбыткаў, а выдаткі фактычна вядзе райвыканком, а калі сельсавет пастанавіў пытаньне аб адчыненьні хаты-чытальні і ўнёс у каштарыс выдаткаў, то РВК скасаваў гэту пастанову.

Адгэтуль, калі арганізоўваць самастойныя бюджэты, а яны вельмі карысны, дык трэба даваць больш самастойнасьці ў сэнсе практычнага ажыцьцяўленьня сваіх гаспадарчых і культурных патрэб.

Другое, чаго трэба дабіцца ў зьмене „асноўных палажэньняў" пра арганізацыю сельсаветаў—гэта не павялічваць тэрыторыю насельніцтва. Трэба, каб кожны сельсавет не абслугоў больш як 3000 душ насельніцтва і ў які-б не ўваходзіла больш 10—15 насельных пунктаў, а то ў нас ёсьць сельсаветы, дзе 20 насельных пунктаў і 10 тысяч насельніцтва, вёска знаходзіцца ў адлегласьці 7—10 кілёмэтраў, дзе цяжка абслугоўваць дастаткова дай меры патрабаваньні насельніцтва.

Трэцяе, трэба зьняць з працы сельсаветаў выкананьне судовых пастаноў па аліментах, па пастановах матар'яльнага характару, зямельных судоў, а то ўся гэта праца адрывае сельсавецкіх працаўнікоў ад непасрэднай працы.

Чацьвёртае,—трэба дабіцца працы нашых сэкцый, якія арганізоўваюцца пры сельсаветах. Як правіла, не разглядаць ніводнага пытаньня на прэзыдыуме сельсавету бяз тэй, або іншай сэкцыі, а сэкцыі сельска-гаспадарчай даць столькі правоў, каб яна была падобна на п-аддзел і вытворчую камісію па прынцыпу фабрычна-завадзкой. У руках такой сэкцыі павінна адбывацца ўся праца па калектывізацыі і ўздыму ўраджайнасьці.

Пятае, — трэба дабіцца, каб у нас сэкратары сельсаветаў былі абавязкова членамі сельсаветаў, якім бы можна было даручыць пячатку і іншую справу, а то зноўдзе сельсавет «чыноўніка», які толькі перашкаджае весьці сацыялістычную перабудову вёскі. Гэтыя зьмены павінны быць уносены, яны дыктуюцца самім жыцьцём.

Я. М. Савіцкі.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Пабудова помніка Леніну.

Віцебск, 24-X. Віцебскі гарадзкі савет вызначыў 30000 руб. на пабудову помніка Ул. І. Леніну.

Буйны калгас імя Леніна.

Гомель, 24-X. У „Дзень ураджаю і калектывізацыі" у Новаграмыцкім сельсавеце, Веткаўскага раёну арганізаваны буйны калгас імя Леніна—на плошчы 2000 гэктараў. Гукаў.

Буйны савгас-камбінат.

Гомель, 24-X. Каб забясьпечыць бэконную фабрыку ў Воршы сыравінай, мяркуецца арганізаваць у Рэчыцкім раёне буйны савгас-камбінат на плошчы звыш 1000 гэктараў. У гэтым савгасе будуць арганізаваны адкормачныя пункты на 5 тысяч бэконных сьвіней.

Апрача таго, мяркуецца арганізаваць рассадзік-мяжнік на 350 матак. На абсталяваньне гэтага савгасу будзе затрачана да 800 т. р.

Аднадзённы заработак на набыцьцё трактараў.

Копысь, 24-X. Калектыў асьветнікаў Копыскага раёну, Аршанскай акругі адлічае 1-дзённы заработак у раённы фонд для набыцьця трактараў, абязуецца праводзіць шырокую растлумачальную кампанію па арганізацыі калектыўных гаспадарак ў раёне.

Разам з гэтым агульны сход асьветнікаў м-ка Копысь выклікае Дуброўскі раён, Аршанскай акругі, пасьледваць нашаму прыкладу.

Абрашкевіч.

1.389 тыс. руб. на ўзмацненьне калгасаў.

Гомель, 15-X. На разьвіцьцё і ўзмацненьне калгасаў акругі мяркуецца выдаткаваць 1.389 тысяч руб. З гэтай сумы 570 тысяч руб. будзе выдаткавана на індустрыялізацыю калгасаў, 111 тысяч на набыцьцё трактараў, 138 тысяч на будаўніцтва жыльлёвых будынкаў, 60.850 руб. на набыцьцё жывёлы, 136 тысяч на сельска-гаспадарчыя прылады.

Першая камуна ў раёне.

(Кругланскі р., Аршанычына).

У в. Тубышках аформілася арганізацыя першай вялікай с-г. камуны ў раёне.

Арганізатарамі камуны зьявіліся 36 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак в. Тубышак. На другі дзень пасьля арганізацыі камуны ад беднаты і серадняцтва пачалі паступаць заявы аб прыняцьці іх у камуну.

Камуна будзе аб'яднаць больш 60 гаспадарак з плошчай зямлі да 500 гэктараў. Арганізацыя камуны РВК зацьверджана. На днях выяжджаюць каморнікі дзеля правядзеньня земляўпарадкаваньня.

Кулацтва в. Тубышак, начале з былым папом Цуканавым, вяло ўзмоцненую працу за зрыў арганізацыі камуны, але-ж беднота і серадняцтва, арганізатары камуны, далі належны адпор. Нова арганізаваная камуна дана назва „Іскра".

Н. Ж.

Выяўлена буйная растрата ў працкалектыве.

Полацак, 24-X. Мясцовым крымвышукам было высьветлена, што загадчык скуранага складу Полацкага працкалектыву скуранікаў Кальвін сыстэматычна краў скуртавары. Рэвізіяй выяўлен недахоп тавараў на суму 1443 р. 27 к.

Вінаватыя ў гэтым злачынстве, на чале з Кольвіным, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

Праверка сацыялістычнага спаборніцтва.

Барысаў, 24-X. На буйнейшых фабрыках і заводах праверка палітычна-гаспадарчых дагавораў у разгары. Уцягваецца ўся маса рабочых. Створаны рабочыя брыгады (дэхавыя і агульна-фабрычныя).

Арганізацыя птушнікаў у калгасах.

У цэлым шэрагу калгасаў Менскай акругі сёлета пабудаваны вузорныя птушнікі. Ужо пабудаваны птушнікі ў калгасах: „Чырвоны Штантар", імя Фрунзэ, імя Карла Маркса, „Абуджэньне", „Прагрэс", „Сейбіт". Усе гэтыя калгасы забясьпечаны гатункавай птушкай.

Праз сыстэму жывёла-малочнай каапэрацыі будзе разьмяркована 500 штук гатункавых пеўняў.

Арганізуем будаўнічы трэст.

Ворша, 24-X. Прэзыдыум Аршанскага акрвыканкому вырашыў пытаньне аб арганізацыі ў Воршы новага будаўнічага трэсту. Патрэба арганізацыі гэтага трэсту выклікаецца тым, што да гэтага часу за будаўніцтвам ня было дастатковага тэхнічнага нагляду; будаўніцтва дрэнна і недастаткова забясьпечвалася матар'ялам і працоўнай сілай, позна і бяз пляну пачыналіся будаўнічыя работы і г. д. Арганізацыя будаўнічага трэсту дасьць магчымасьць пазбавіцца ад гэтых недахопаў. Значнае пашырэньне будаўніцтва ў надыходзячым гаспадарчым годзе, выдаткі на якое павялічваюцца больш як у два разы супроць мінулага году і перавысяць 3.000.000 руб., таксама выклікае патрэбу арганізацыі гэтага трэсту. Новаму трэсту будуць перададзены ўсе прадпрыёмствы, якія займаюцца выпрацоўкай будаўнічых матар'ялаў. Дзякуючы арганізацыі будаўнічага трэсту, будзе ліквідаваны акруговы прамысловы трэст, прадпрыемствы якога будуць перададзены часткова новаму будаўнічаму трэсту, часткова райвыканкомам і камунальна-абслугоўваючаму камбінату ў горадзе.

Падпіска на пазыку праходзіць пасьпяхова.

Полацак, 24-X. Падпіска на III пазыку ў Асьвейскім раёне праходзіць здавальняюча. Па ўсіх сельсаветах была праведзена належная растлумачальная праца, адбылося шэрах сходаў з дакладамі пра пазыку.

Папярэднія вынікі паступныя: на 10 кастрычніка ў раёне распаўсюджана пазыкі па 26610 руб.—выканана 110,8 проц. заданьня. З гэтага ліку сярод рабочых і служачых распаўсюджана 15215 і сярод сялян на 10005 руб. Падпіска працягваецца.

Дамо вылучэнцаў у саветы.

Ворша, 24-X. У сучасны момант на Аршанчыне праводзіцца падрыхтоўчая праца да большага вылучэньня рабочых, батракоў і беднаты, у тым ліку і жанчын, на працу ў саветах, выканкомах і ўстановах. Усім загадчыкам і інспэктарам устаноў, а таксама райвыканкомам і Аршанскаму гарсавету прэзыдыум запрапанаваў у самы кароткі тэрмін даць свае меркаваньні адносна таго, якія пасады ў іх установах патрэбна замясьціць вылучэнцамі. Гэта пытаньне папярэдне будзе абгаварвацца з адпаведнымі кіруючымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі. Пасьля таго, як усе ўстановы, саветы і райвыканкомы выявяць усе тыя пасады, якія павінны быць заняты вылучэнцамі, кандыдатуры вылучэнцаў на гэтыя пасады будуць абгаварвацца на шырокіх сходах рабочых, батракоў і беднаты.

За няўважлівасьць у працы да адказнасьці.

Барысаў, 24-X. У часе правядзеньня асеньняй пасеўкампаніі некаторыя сельсаветы не аддавалі ўвагі сацыялістычнаму спаборніцтву, не выкарыстоўвалі поўнасьцю сельска-гаспадарчых машын, несваечасова або зусім не давалі вестак аб ходзе кампаніі. Па пастанове райвыканкому Карсаковіцкі, Нова-Сельскі і Метчанскі сельсаветы прыцягваюцца да адказнасьці.

Клюб для чыгуначнікаў

Віцебск, 24-X. Да гэтага часу чыгуначнікі Віцебскага вузла ня маюць памяшканьня пад клюб для правядзеньня культурна-масавай працы. Прымаючы гэта пад увагу, прэзыдыум акрвыканкому вынес пастанову аб пабудове на ст. Віцебск клюбу для чыгуначнікаў. З свайго боку акрвыканком дасьць месца для пабудовы клюбу, дасьць патрэбную колькасьць цэглы і ўжо хадайнічае перад СНК БССР аб воднуску сродкаў на абсталяваньне клюбу. Таксама акрвыканком ставіць пытаньне аб пабудове клюбу і перад праўленьнем МББ і Дорпрафсожам, каб яны ўзялі на сябе рэшту выдаткаў па пабудове клюбу. Пабудову клюбу мяркуецца распачаць з вясны 1930 году.

Садоўніцтва ў раёне расьце з кожным годам.

Барысаў, 24-X. У часе правядзеньня асеньняй пасеўнай кампаніі вялікая ўвага вывернута на павялічэньне садовай плошчы ў раёне. Па пляну меркавалася пасадзіць 2940 дрэў, а пасаджана 4840. Апрача гэтага, пасаджаны 2 групавыя сады на плошчы ў 40 гэктараў.

Мазаіка жыцьця*).

**Больш увагі самым простым, але жывым, з жыцьця ўзятым, жыцьцём правераным фактам намуністычнага будаўніцтва—гэты лёзунг трэба вяўстанна паўтараць усім нам, наш

У Полаччыне не скарысталі апошні тыраж для папулярызацыі пазык

(З пасяджэньня цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе).

Пазаўчора пад старшынствам тав. **Хацкевіча** адбылося пасяджэньне цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаднай справе. Першым пытаньнем былі абгавораны вынікі правядзеньня ў Полаччыне тыражу пазыкі ўзмацненьня с. гаспадаркі.

З інфармацыі прадстаўніка Наркамфіну, які выяжджаў для правядзеньня тыражу, відаць, што падрыхтоўчая праца была праведзена сваечасова і больш чым здавальняюча. З пытаньняў дакладчыка і ў спрэчках высьветлілася зусім іншае. Можна сьмела сказаць, што полацкія і мясцовыя прафарганізацыі зусім ня вучлі важнасьці правядзеньня ў іх акрузе тыражу для папулярызацыі сярод працоўнага насельніцтва дзяржаўных пазык. Асабліва ў гэтай галіне праявілі сваю „надзвычайную актыўнасьць“ полацкія арганізацыі. Была дагаворанасьць з акрпрафсаветам аб тым, каб у апошнія 2 дні тыражу наладзіць экскурсіі членаў прафсаюзаў у Ветрына, дзе праводзіўся тыраж. З такім разрахункам і быў набудован плян правядзеньня тыражу. У выніках першыя два дні тыражу нардом быў набіт да адказу сялянамі, а апошнія 2 дні праца тыражнай камісіі праводзілася ў пустой залі, бо экскурсіі з Полацку ня было, прафсаюзы забыліся іх арганізаваць. Звалілі з Ветрына ў Полацак па тэлефону,—таварышы-палачане, чаму ня едуць экскурсіі рабочых.

З Полацку адказваюць:

Дайце грошай, дык наладзім экскурсіі... Адказ, так сказаць, клясычны і на ім спыняцца мы ня будзем...

Што-ж было зроблена на месцы тыражу, каб прасунуць у гушчы сялянства дзяржаўную пазыку?

Ды нічога. За ўвесь час тыражу прададзена аблігацый пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі толькі на 1000 руб. і ніводнай аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі. Між тым правядзеньне тыражу павінна было стымуляваць разгортваньне кампаніі па рэалізацыі новай пазыкі індустрыялізацыі.

У час тыражу выявілася яшчэ адна вельмі цікавая рэч, якая сьведчыць аб надзвычайна нядбайных адносінах нашых фінансавых і крэдытных устаноў, якія павінны папулярызаваць і прасоўваць у працоўныя масы пазыкі. А вось і факты: у кіёску аддзяленьня дзяржбанку адзін з членаў тыражнай камісіі набыў аблігацыю пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі. Калі пасьля тыражу пачалі правяраць, дык аказалася, што на гэту аблігацыю прыпаў выйгрыш яшчэ ў першым тыражы. Адгэтуль відаць, што фінансавая ўстанова набыла ў нейкага селяніна аблігацыі, не праверыла яе і ня выплаціла яму выйгрышу, і нават зноў прадала яе без праверкі. Пачалі па просьбе аднаго селяніна праверяць яго аблігацыю і зноў на яе ў ранейшых тыражох прыпаў выйгрыш. Пытаюцца селяніна, ці праверяў яму хто аблігацыю,—аказваецца ён зварачваўся ў с.-гасп. крэдытнае таварыства, на пошту і яшчэ ў некую ўстанову і ўсюды яму адказвалі, што па яго аблігацыі выйгрышаў няма. Гэты факт лепш за ўсё сьведчыць, як на мясцох папулярызуюць і прасоўваюць дзяржаўныя пазыкі.

Цэнтральная камісія канстатавала, што вынікі тыражу як у палітычных, так і ў практычных адносінах нездавальняючыя. Прафсаюзныя арганізацыі не ўдзялілі ніякай увагі папулярызацыі тыражу сярод членаў саюзаў. Камісія лічыць зусім недапушчальным, што ў час тыражу ня было рэалізавана ніводнай аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Даручана Полацкай акрокамісіі садзейнічаньня дасьледваць выпадак з селянінам, якому ў крэдытных установах адказвалі, што на яго аблігацыю выйгрышаў не прыпаў, і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Усім камісіям садзейнічаньня даручана разгарнуць працу па выяўленьню выйгрышаў па апошняму тыражу і неадкладна іх выплачваць. Наркамфіну даручана ў 3-х дзённы тэрмін надрукаваць табліцы апошняга тыражу ў газэтах і спэцыяльнай брашуры.

Беларусізацыя па-за межамі БССР.

Справа беларусізацыі на Смаленшчыне.

(Ад нашага карэспандэнта).

Нацпалітыка савецкай улады ставіць сваёй задачай узьняць заняпалыя нацменшасьці да агульнага больш высокага ўзроўню. У сувязі з пяцігадовым плянам разьвіцьця народнае гаспадаркі пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці — усеагульнае навучаньне сярод нацменшасьцяў набываюць вялізарнае значэньне.

Патрэбны значныя кадры культурных працаўнікоў - нацменаў, якія-б змаглі поўнасьцю скарыстаць родную мову, як сродак для больш пасьпяховай барацьбы на культурным фронце.

У цэнтры падрыхтоўкі такіх працаўнікоў сярод беларускага насельніцтва на Смаленшчыне трэба паставіць беларускае аддзяленьне Смаленскага рабфаку пры Дзяржаўным Унівэрсытэце, якое існуе ўжо 4-ы год.

Навакол яго аб'яднаюцца студэнты-беларусы Унівэрсытэту, абласной партшколы, фармацэўтнага і мэдыцынскага тэхнікумаў. Утварэцца беларускае зямляцтва, якое налічвае ў сваім складзе звыш 200 сяброў. Вядзецца кантоўная праца.

За мінулы год драматычным гуртком зямляцтва было зроблена 7 пастановак, чатыры разы выступаў беларускі хор, былі выступленьні з беларускімі нацыянальнымі скокамі. Частка пастановак і выступленьняў адбылася ў казармах №-га палку, дзе каля паловы чырвонаармейцаў—беларусы.

Ва ўсе навучальныя ўстановы, дзе ёсьць сябры зямляцтва, выпісваецца ў дастатковай колькасьці беларуская літаратура, часопісы і газэты. Пры унівэрсытэце выходзіць беларуская насьценгазэта, у партшколе існаваў беларускі гурток.

Праца зямляцтва досыць шырока разгорнута і па лініі шэфскай працы на вёсцы. Былі праведзены ў розных вёсках гутаркі і лекцыі на розныя тэмы—аб жаночых хваробах, аб рэлігійным дурмане і сьвятах пралетарскіх, аб пасяўной кампаніі і г. д. Вядзецца праца па ўзмацненьні на вёсцы беларускае школы, апошнім зроблена значная матарыяльная дапамога: набыты зямляцтвам геаграфічныя карты, падручнікі, сшыткі, дзіцячыя бібліятэчкі, плякаты, бібліятэчкі на сельскай гаспадарцы.

У канцы трэба адзначыць адсутнасьць сталага кіраўніцтва з боку ЦБ пралетэтуду Беларусі.

Чарговыя задачы культурнай пяцігодкі патрабуюць усямернага падтрыманьня зямляцтва ў сэнсе ўтварэньня належных умоў для далейшага яго росту за лік поўнага ахопу беларускай моладзі г. Смаленску, а таксама ў сэнсе шырокага абслугоўваньня імі беларускага насельніцтва Смаленшчыны.

М. Р.

„ФАНТАНКА 27“.

На рагу рэчкі Фантанкі і б. Неўскага праспэкту, у цэнтры Ленінграду разьмясьціўся беларускі дом асьветы—у вялізным палацы ранейшага цецярбурскага гарадзкога галавы.

Пройдзем па адведзеных, угульных, добра абстаўленых 10 залях, і вы зьдзівіцеся творчай працы, якая праводзіцца беларусамі ў гэтым палацы.

Усюды заклікі, лёзунгі, прывітаньні на роднай мове. У размове, гутарках чуецца беларуская мова, словам, ва ўсім адчуваеш сваё, блізкае, роднае. Гэта—на першы погляд, але чым глыбей знаёмішся, тым больш яснай робіцца праца дому асьветы.

Ёсьць цэлы шэраг мастацкіх гурткоў:

Драматычны гурток—імя т. Галубка—ставіў шмат беларускіх п'ес, выключна на беларускай мове, якія прайшлі з вялікім посьпехам.

Харавы—вывучае беларускія песьні пад кіраўніцтвам кампазытара Ігнатоўскага.

Літаратурны—ставіць мэтаю азнаёміць з беларускаю культураю.

Неапалітанскі аркестр—выступае з інтэрнацыянальнай баявой, поўнай прызыву, музыкай.

Гісторыка - этнаграфічны — для працы ў гэтым гуртку прыцягваюцца студэнты, якія скончылі ВУЗ.

Жывая газэта—заклікана адлюстроўваць злобадзённае палітыка-гаспадарчае жыцьцё Беларусі і дому асьветы.

Юнсэкцыя—працуе сярод моладзі. Сэкцыя шчыра ўзялася за працу і разгарнула яе ўпыркі і ўдоўжкі. Прыкладам можа служыць той факт, што на апошнім сходзе беларускай моладзі абмяркоўваліся вынікі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б і была прынята рэзалюцыя, якая рашуча ганьбіць ухілы, ухільчыкі нацыянал-шавінізму і ўхваляе ўсе пастановы апошняга беларускага пленуму. Але гэта ня ўсё.

Сёлета будуць заснаваны гурткі: антырэлігійны, бягучай палітыкі, вывучэньня беларускае мовы.

Апрача таго, праводзіцца падрыхтоўчая праца да наладжаньня ў пачатку лістапада спэцыяльнага вечару беларускае літаратуры і музыкі, на якім будуць чытацца творы беларускіх пісьменьнікаў. Ня лішнім будзе, калі ўспомнянуць, што за кароткі час адбылося 26 мастацкіх беларускіх пастановак, на якіх прысутнічала 4800 чалавек, 12 вечароў самадзейнасьці—3000 чалавек, даклады, лекцыі і г. д.

Зразумела, ёсьць даволі шмат дэфэктаў у працы клюбу. Шмат што яшчэ не пастаўлена на адпаведную вышыню, шмат што дрэнна абслугоўваецца.

Актыўных і афіцыйных членаў дому асьветы налічваецца 350 чалавек. Гэта—мізэрная лічба ў параўнаньні з сапраўдным беларускім насельніцтвам. У межах г. Ленінграду, водлуг даных абласнога статаддзелу за 27 г., пражывала беларускага насельніцтва 14625 чалавек, зараз, зразумела, гэтая лічба значна ўзрасла.

Большасьць з іх—гэта беларускія заходнікі, якія засталіся ў Ленінградзе ў часе імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны. У масе сваёй—рабочыя і служачыя. Па райёнах Ленінграду яны разьмяркоўваюцца так: Выбарскі райён—1722 чал., Цэнтральна-Гарадзкі—4100; Петраградзкі—1484 чал., Маскоўска-Нараўскі—2533, Валадарскі—1792 чал. Васіле-Востраўскі—2994 ч. Працаваць з гэтай раскіданай масай зьяўляецца справай вельмі цяжкай. Вучот беларусаў па заводах і фабрыках не вядзецца, і дому асьветы прыходзілася выяўляць беларусаў праз завкомы і калектывы пры дапамозе сваіх упаўнаважаных.

Летась Наркамасьветы Беларусі асыгнаваў клюбу ў выглядзе датацыі—2000 р., сёлета аб ім пакуль ня чуваць. і гэта называецца „дапамагаць“ у эпоху вялізарных зрухаў і культурных заваёў.

Як думаюць праводзіць работу ў далейшым?

Сёлета будзе праведзена вялікая праца на пэрыфэрыі для ўцягваньня працоўных беларусаў у дом асьветы, па ўсіх буйных заводах будуць свае ўпаўнаважаныя, будуць таксама наладжвацца супольныя вечары рабочых данага заводу з домам асьветы. Распачата арганізацыя беларускіх куткоў пры клюбах заводаў і фабрык і пры іх бібліятэчкі-перасоўкі, якія будуць абслугоўвацца сваімі агітатарамі і прапагандыстамі.

Зразумела, усё гэта будзе выканана, калі за гэта дружна возьмецца наша беларуская савецкая грамадзкасьць.

Гузікаў.

Новы старшыня ЦП саюзу працасьветы т. С. П. Рычкоў.

Як у нас паведамлялася, пленум ЦП саюзу працаўнікоў асьветы старшыней ЦП абраў тав. Рычкова.

Тав. Рычкоў чатыры гады быў настаўнікам, член партыі з 1921 году, у 1922 годзе ён быў сэкратаром ячэйкі ў Віцебшчыне. З канца 1922 году т. Рычкоў быў загадчыкам АПА Лепельскага павятовага камітэту партыі, потым працуе ў інфармацыйным аддзеле ЦК КП(б)Б. Па мабілізацыі партыйцаў у 1924 годзе т. Рычкоў накіроўваецца на працу ў Барысаўскую акругу. На акруговай партыйнай канфэрэнцыі Барысаўшчыны тав. Рычкоў абіраецца членам бюро акругкому КП(б)Б і да канца 1926 году працуе загадчыкам АПА акругкому. З канца 1926 г. т. Рычкоў перакідваецца ў Гомельшчыну і на акруговай партканфэрэнцыі абіраецца членам бюро і заг. АПА акругкому. З лютага 1928 г. тав. Рычкоў да апошняга часу быў рэдактарам „Полесской Правды“ і адначасова быў членам акруговага праўленьня саюзу асьветнікаў.

ХРОНІКА

На загатоўчым фронце.

Эшалён бульбы адпраўлен у Маскву.

Учора днём быў накіраван у Маскву першы чырвоны эшалён бульбы. З вячэрнім хуткім цягніком выехала ў Маскву дэлегацыя рабочых менскіх прадпрыёмстваў рабочых савгасаў і калгасьнікі, для перадачы эшалёну бульбы пралетарыяту Масквы.

Учора ў Менск прыбыў чырвоны абоз бульбы.

З Астрашыцкага-Гарадка, Старага Сяла і іншых бліжэйшых вёсак учора ў Менск сяляне прыехалі з чырвоным абозам бульбы. Усяго сяляне прывезьлі 12.000 пуд. бульбы.

Апарат Белкаапсаюзу працуе дрэнна.

ЦП саюзу савгандлькслужачых, абсьледаваўшы працу Белкаапсаюзу, знайшло, што пры загатоўках хлеба былі выпадкі скажэньня клясавай лініі прэміравалі кулацкія гаспадаркі і г. д. Бульбы Белкаапсаюз загатовіў зусім мала, патрэбна было загатовіць 626 тысяч тон, а загатоўлена ўсяго 16 тыс тон, што складае вельмі нязначны проц. заданьня. Сацыяльны склад загатоўцаў мяса вельмі дрэнны, у яго шэрагах і па сёньня знаходзіцца 50 проц. гандляроў, кулакоў і нэпманаў. Трэба адзначыць, што Белкаапсаюз з загатоўкай бульбы спазьніўся. Выходзячы з усяго гэтага ЦП саюзу прапануе: паставіць пытаньне перад гарсаветам аб лепшым хаваньні мяса і жывой жывёлы.

Тэрмінова напоўніць склад загатоўчыкаў шляхам набору броні, рабочых і г. д.

Добра наладзіць прыём чырвоных абозаў, каб ня было ніякіх прастояў у здачы хлеба абозамі.

Апрача гэтага, трэба зьвярнуць значную ўвагу загатоўкам бульбы, бо Белкаапсаюз на гэта мала звзрачаў увагі.

На дапамогу збору бульбы.

ЦП саюзу савгандлькслужачых выдзеліла брыгаду на дапамогу загатоўкі бульбы пралетарскім цэнтрам. Усяго выдзелена 6 чалавек. Брыгага сёньня едзе на раёны.

Вымова за слабую працу.

Пазаўчара на пасяджэньні Прэзыдыуму Менскага АВК быў абгаворан даклад Менскага Аддзяленьня Белкаапсаюзу аб ходзе загатовак па акрузе. Па вестках на 23-е кастрычніка гадавы хлеба-загатоўчы плян выканан ужо на 74,4 проц. Асабліва добра справа з загатоўкай хлеба абстаіць у Смалявіцкім раёне, які сваё гадавое заданьне выканаў ужо на 170 проц. Астрашыцка-Гарадзецкім—гадавое заданьне выканана на 157 процантаў. Лагойскі раён свой гадавы плян выканаў на 121 проц. і Сьмілавіцкі—на 112.

Зусім кепска разгорнуты хлебазагатоўкі ў Капыльскім і Грэскім раёнах, якія свае гадавыя пляны выканалі толькі на 25-27 проц.

Прэзыдыум АВК абавязаў Менскае Аддзяленьне Белкаапсаюзу выканаць поўнасьцю гадавы плян хлебазагатовак да першага лістапада. Побач з гэтым пастаноўлена абвясьціць выгавар за слабую работу ў галіне хлебазагатовак Прэзыдыумам Копыльскага і Грэскага райвыканкомаў.

Асьветнікі ў паходзе за грамату.

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму ЦП Саюзу Белпрацасьветы разгледжана пытаньне аб удзеле асьветніцкай масы Беларусі ў ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў саюзу Сельгасрабочых і Нархарчаваньня.

Паводле пастановы Прэзыдыуму, асьветнікі Беларусі ў парадку грамадзкай работы павінны ліквідаваць няпісьменнасьці сярод 3735 членаў саюзу Сельгасрабочых і 750 членаў саюзу Нархарчаваньня. Гэтыя лічбы адпаведным чынам размеркаваны паміж нізавымі арганізацыямі саюзу Працасьветы.

Апрача гэтага, Цэнтральным Праўленьнем Саюзу дадзены падрабязныя паказаньні ўсім нізавым арганізацыям адносна самой тэхнікі правядзеньня гэтае працы.

75 т. р. на завочнае навучаньне

Па бюджэту Наркамасьветы БССР адпушчана ў бягучым годзе на выдаткі па завочнаму навучаньню 75.200 руб. Наркамасьветы разьмяркаваў гэтыя грошы паміж завочнымі: пэдфакам БДУ, сялянскім унівэрсытэтам, Камвузам, рабфакам, пэдтэхнікумам, савпартшколай і Радыё-Унівэрсытэтам.

У нядзелю адчыняецца новая лінія трамваю.

З Мытышчаў у Менск прыбыло яшчэ 5 трамвайных вагонаў. Учора яны выгружаліся. У трамвайным кіраўніцтве нашага супрацоўніка паведамілі, што з нядзелі 27 кастрычніка мяркуецца адчыніць курсаваньне трамваю па двух лініях: Пасажырскі вакзал—Пляц Волі і другая лінія Камароўка—Таварны вакзал МББ.

У студзені 1930 г. кіраўніцтва чакае атрымаць яшчэ 10 трамвайных вагонаў.

Дырэктывы Эканомнарады на выкананы.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому абгаварыў інфармацыю аб ходзе працы па арганізацыі адкормачных пунктаў рагатай жывёлы.

Паводле дырэктыў Эканомнарады Белмясгандаль, Белсельтрэст і Белдзяржсьпірт на Меншчыне павінны былі арганізаваць адкормачныя пункты па 500 галоў рагатай жывёлы. Але аказваецца гэтыя арганізацыі дырэктыў Эканомнарады ня выканалі і дагэтуль не паставілі на адкорм жывёлу.

Белмясгандлю, аддзяленьне Белкаапсаюзу, малочны саюз і Менскі ЦРК паявіны былі наладзіць адкорм 2000 сьвіней, але і тут таксама нічога ня зроблена.

Прэзыдыум АВК даручыў інспэкцыі гандлю высьвятліць вінаватых для прыцягненьня да адказнасьці. Побач з гэтым пастаноўлена: давесьці да ведама Эканомнарады аб тым, што банкі дагэтуль не адпусьцілі крэдытаў на адкорм сьвіней.

Да ўсесаюзнага зьезду ўдарных брыгад.

На аснове пастановы УсеЦСПС ЦСПСБ адманіў рашэньне аб скліканьні ўсебеларускага зьезду ўдарных брыгад.

ЦСПСБ канчаткова разьмяркаваў 11 месцаў на ўсесаюзны зьезд ударных брыгад паміж буйнымі прадпрыёмствамі Беларусі.

Перад УсеЦСПС узьнімаецца хадайніцтва аб дазволе дадаткова камандіраваць аднаго ўдарніка ад шклозаводаў БССР.

Скарбоначны збор на карысьць т-ва „П. Н.“.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому дазволіў акруговаму таварыству „Прэч Няпісьменнасьць“ правесьці на працягу лістапада скарбоначны збор на ўзмацненьне сродкаў таварыства.

ЗАЎВАГА

При друкаваньні рэзалюцыі верасеньскага пленуму ЦК друкарняй дапушчана памылка: на старонцы 56 у радку 9 залюцыі аб ходзе сацыялістычнага ... ...ворніцтва і якасці ... казчыках ... прамысловасьці пасьля слова рэканс... надрукавана:—у нашай краіне і ва ўсім сьвеце, трэба рэканструкцыі народнае гаспадаркі“.

МОПР НА ЗАГАТОЎКУ БУЛЬБЫ.

Менакругком Мопру склікае ў нядзелю, 27-га кастрычніка, у клюбе Карла Маркса экстраную агульна-гарадзкую нараду Мопраўскага актыву па пытаньню ўдзелу мопраўцаў у загатоўцы бульбы для працоўнага насельніцтва.

З гэтай мэтай, Менакругком Мопру мабілізуе ўсіх актывістых мопраўцаў гор. Менску для збору мяшкоў для загатоўкі бульбы сярод гарадзкога насельніцтва.

Таму Менакругком Мопру зварочваецца да ўсяго працоўнага насельніцтва дапамагчы мопраўцам у гэтай вялікай і важнай рабоце, бо ... хаце знойдзецца лішні мяшок, жа прынесьці вялікую карысь справе загатоўкі бульбы для ... нага насельніцтва.

Трэба спадзявацца, што ўсе ... ныя гораду, хатнія гаспадыні ... грамадзяне гор. Менску прыйдуць ... тыўны ўдзел у ініцыятыве м... і дадуць лішнія мяшкі зборш...

Усе на дапамогу загатоўцы ... для бульбы!

Усе актывістыя-мопраўцы ... зьявіцца на нараду актыву.

Ц...

„Сав. Беларусь“ дапамагла

ПАСТАЎЛЕНА НА ВІД.

Допіс—„Сапсаваўся“ расьсьледваньнем Аршанскай акруговай кантрольнай камісіі КП(б)Б і РСІ поўнасьцю падцьвердзіўся. Быў выпадак, што т. Гардзецкі груба адказаў сябру партыі т. Ліўшыцу і запрапанаваў яму высьці з габінэту, а таксама груба абляяў партыйца Грутко, за што у час чысткі яму пастаўлена на від.

З ПРАЦЫ ЗЬНЯТ.

Допіс „У хаўрусе з кулаком“, ... ны ў газэце „Савецкая Беларусь“ ... верасьня г. г. расьледваньнем ... вердзіўся. Грам. Кавалёў з праці... ніцкім лясьціцтве зьнят. Гэты-ж ... падаваў заяву ў Азерскую вуч... аб прыняцьці яго на другую пр... там яму адмовілі.

Украдзены аблігацыі.

1-й пазыкі індустрыялізацыі:

Сер. 82476 № 28—1/5; сер. 70466 № 39—1/5; сер. 133575 № 37—1/5; сер. 78026 № 20—1/5; сер. 133890 № 43—1/5; сер. 132555 № 01—1/5; сер. 132447 № 18—1/5; сер. 133586 № 37—1/5; сер. 133587 № 37—1/5; сер. 97641 № 42—1/5; сер. 94301 № 23—1/5; сер. 78522 № 35—1/5; сер. 86575 № 30—1/5; сер. 105557 № 47—1/5; сер. 82322 № 28—1/5; сер. 82474 № 28—1/5; сер. 135592 № 35—1/5; сер. 135591 № 35—1/5; сер. 95101 № 27—1/5; сер. 110184 № 27—1/5; сер. 122886 № 23—2/5; сер. 122884 № 23—6/5; сер. 98525 № 29—3/5.

2-й пазыкі індустрыялізацыі бяспроцантн.:

№ 19 сер. 20338—1/5; № 19 сер. 20337—1/5; № 19 сер. 20336—1/5; № 19 сер. 20335—1/5; № 19 сер. 20334—1/5; № 19 сер. 20332—1/5; № 19 сер. 20331—1/5; № 19 сер. 20333—1/5; № 19 сер. 20329—1/5; № 19 сер. 20325—1/5; № 19 сер. 20322—1/5; № 19 сер. 20321—1/5; № 19 сер. 20320—1/5; № 19 сер. 20323—1/5; № 19 сер. 20324—1/5; № 19 сер. 20316—1/5; № 19 сер. 20317—1/5; № 19 сер. 20318—1/5; № 19 сер. 20319—1/5; № 19 сер. 20330—1/5; № 06 сер. 5219—1/5; № 06 сер. 5216—1/5; № 06 сер. 5218—1/5; № 07 сер. 3251—1/5; № 25 сер. 49696—1/5; № 09 сер. 44477—1/5; № 24 сер. 9413—1/5; № 24 сер. 9527—1/5; № 24 сер. 9538—1/5; № 02 сер. 56730—1/5.

10-проц. дзярж. пазыка 1927 г.:

Сер. 10 № 19043—1/1; сер. 06 № 15161—1/1; сер. 06 № 151584—1/1; сер. 12 № 070109—1/1; сер. 07 № 6199—1/1; сер. 12 № 70093—1/1; сер. 16 № 56539—1/5; сер. 03 № 89660—1/5; сер. 08 № 162697—1/5; сер. 08 № 162697—1/5; сер. 10 № 39693—1/5; сер. 10 № 39693—1/5; сер. 10 № 39692—1/5; сер. 10 № 39692—1/5; сер. 08 № 162695—1/5; сер. 08 № 162696—1/5; сер. 16 № 56532—1/5; сер. 16 № 56531—1/5; сер. 16 № 56530—1/5; сер. 14 № 172825—1/5; сер. 16 № 5... сер. 16 № 56534—1/5; сер. 14 № 7... —1/5; сер. 16 № 56488—1/5; ... № 56590—1/5; сер. 16 № 56487—... 16 № 56487—1/5; сер. 16 № 17... сер. 16 № 56634—1/5; сер. 16 № ... —1/5; сер. 16 № 81049—1/5; ... № 81038—1/5; сер. 16 № 81025—... 16 № 79771—1/5; сер. 16 № 79... сер. 16 № 79393—1/5; сер. 03 № ... —1/5; сер. 03 № 033231—1/5; ... № 033233—1/5; сер. 03 № 33397; ... № 33379—2/5; сер. 03 № 33378—... 03 № 33380—2/5.

Пазыкі ўмацаваньня с... скай гаспадаркі:

Сер. 11 № 171234; сер. 11 № ... сер. 11 № 171228; сер. 11 № ... сер. 11 № 171231; сер. 11 № ... сер 11 № 171233; сер. 11 № ... сер. 11 № 17121—1/5; сер. 11 № ... —1/5; сер. 11 № 203862; сер. 11 № ... сер. 11 № 203871; сер. 11 № ... сер. 11 № 203873; сер. 11 № ... сер. 11 № 203875; сер. 11 № 013... сер. 11 № 057723—1/5; сер. 11 № ... —1/5; сер. 48 № 111848—1/5; ... № 111845—2/5; сер. 48 № 184384; ... № 111846; сер. 48 № 240355; ... № 240356; сер. 48 № 240357; ... № 240354; сер. 48 № 111850—4/5; ... № 111849—1/5; сер. 48 № 240362; ... № 240363; сер. 48 № 240358; ... № 240355.

2-ой пазыкі індустр. ... цэнтн.

№ 11 сер. 17908—1/5; № 10 се... —1/5; № 16 сер. 41673—1/5; № ... 27861—1/5; № 10 сер. 23725—1/5; ... сер. 46681—1/5; № 03 сер. 35... № 18 сер. 52806—1/5; № 20 сер. ... № 11 сер. 17685—1/5.

6 проц. дзярж. пазыкі:

Сер. 01—0454775; сер. 05—113... лежачыя гр-ну Хаскіну, Б.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 26 КАСТРЫЧНІКА 1929 ...

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.97,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.25	130. 25
Выйгр. пазыка 1929 г. .	100.55	100.95
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.46	25.56
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.03	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25,31	
2 „ „ „ проц.	25.41,5	
2 „ „ „ 6-проц.	25.42,3	
11 проц. дзярж. паз. 1928 г. . . .	101.69	
12 проц. рэнтн. паз. 1927 г. . . .	104.79	

Апавяшчэньні.

У нядзелю 27 кастрычніка г. г. з 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Гарсавету скліканецца агульны сход дамашніх гаспадань Жжатаў.

ПАРАДАК ДНЮ:

1) Аб падрыхтоўцы да сьвята Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

2) Аб зборы тары для хлеба і бульбы нарыхтоваи.

Уваход на сход па білетах, разасланых па партячэйках і жжатах.

Пасьля сходу кіно.

ПЭДГАБІНЭТ.

1) У нядзелю, 27-га кастрычніка ў 6 гадзін увечары пасяджэньне Менскае Акруговае Мэтадычнае Камісіі.

ПАРАДАК ДНЮ:

1) Формы падзіку пасьпяховасьці вучняў і падзін працы школ.

2) Разгляд рэзалюцыі аб самакіраваньні ў школах сацвыху.

Яўка сяброў Мэтадычнае Камісіі абавязкова. ЗАПРАШАЮЦЦА НАСТАЎНІКІ.

2) У панядзелак 28-га кастрычніка ... гадзін увечары заняткі гуртоў па ... НАВАНЬНЮ І ЖЫВОМУ СЛОВУ ... кольніц.

3) У панядзелак 28-Х роўна ў ... увечары сход СЭКЦЫІ ПА АМТЫР... НЫМ выхаваньні ў школе.

Яўка настаўнікаў, якія запісаны сэкцыю, абавязкова.

4) У панядзелак 28-Х-г. г. Пэ... сумесна з Домам Асьветы наладж... ЧАР ПЭДАЛЕГІІ Ў ШКОЛЕ. Прафэсарэхція Г. Н. прачытае даклад на ... „Рэфлексалёгічным тымы дзіцяці“ ... цэнт Гайвароўскі—на тэму „Пэдагагічная масавая школа“.

Запрашаюцца асьветнікі і сябры ... гічнай асоцыацыі.

Пачатак у 8½ гадзін увечары.

Адказны рэдактар П. ШАСТАК...

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.	З панядзелка 21 кастрычніка **„З 1-м красавіком“** амэрыканская камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: культфільм у 3-х частках «ПАЛЯВАНЬНЕ НА ГАРЫЛУ».
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 21 кастрычніка амэрыканскі фільм **„Радыё і леў“**. Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 57. Пачатак а 7 гадзіне.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.	З панядзелка 21 кастрычніка **„Сэрца Азіі“** кіно-нарыс у 6 частках. Звыш праграмы: цікавая камэдыя „Янка піанэр“. Каса адчынена ад 2 гадз.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“	Новы фільм вытв. „Савкіно“ **„Каін і Арцём“** драма ў 6 частках. Пачатак а 7 г. 15 хв.

БЕЛАРУСКАЯ К-РА АКЦ. Т-ВА

„САЮЗХЛЕБ“ І БЕЛКААПСАЮЗ

абвяшчаюць для ведама ўсіх устаноў, прадпрыёмстваў, арганізацый і ўсіх грамадзян, што

ПРЫЁМКА МЯХОЎ ЗА ПЛАТУ

ПА ЎСТАНОЎЛЕНЫХ ЦЭНАХ

ВЫТВАРАЕЦЦА ва ўсіх пунктах Саюзхлеба і каапэрацыйных крамах, складах і пунктах.

СУД-ВЫКАНАЎЦА 2 ВУЧ. МЕНСКАЙ АКРУГІ

АПАВЯШЧАЕ,

што 30-га кастрычніка 1929 г. а 12 гадзіне дня

АДБУДЗЕЦЦА ПРОДАЖ

маемасьці Койданаўскай каўбаснай арцелі „МУРАВЕЙНІК“ у мест. Койданава,

якая складаецца з матора і іншай маемасьці. Ацэнка 650 р.

6-га лістапада 1929 г. а 10 гадзіне раніцы адбудзецца продаж будынкаў, застройка па Віленскаму завулку дом № 126, які належыць гр. Чынчыку Алесю Алесяву, ацэнка 1300 руб. на спагнаньне грошай у карысьць дзяржустаноў па суд-загадам.

У выпадку, калі першы таргі не адбудуцца, паўторныя таргі назначаюцца: каўбаснае арцелі на 13 лістапада 1929 г., а Чынчыка на 15 лістапада ў тыя гадзіны што і пры першых таргох.

Жадаючыя таргавацца запрашаюцца на паказаныя гадзіны на месца таргоў па месту знаходжэньня маемасьці.

Аб усіх спраўках і ўмовах продажы можна даведацца штодзённа ў Бюро суд-выканаўцаў Менск вул. К. Маркса д. № 5.

Суд-выканаўца 2 вуч. Мен. акр. ПЕНКРАТ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Чырвонаарм. кніжка Бандаровіча І., выд. вайсковым сталом рудніка Карла Маркса Арцемаўск. акр., кв. 11п.

— Вайсковы білет Валодзька П. М., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 12п.

— Конская карт. Цепленка П. Я., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 13-п.

— Службовая кніжка вайскова-абавязанага № 2184 Семяненка І., выд. Каралінскім РВК, кв. 67п.

— Сяброўскі білет № 697 Жучкоўскага В., выд. Мазырск. саюзам працасьветы, кв. 68п.

— Паявая кніжка № 3918 Гофнана М., выд. Мазырск. праўл. ЦРК, кв. 69п.

— Кніжка на кармленьне дзіцяці № 1027 Сеўзюка А. П., выд. Менакрстрахкасай, кв. 27.

— Сяброўскі білет № 6841 Ашаровай П. М., выд. ЦП саюзу працасьветы, кв. 28.

— Мэтрычн. выпісь Плоткін Я. А., выд. Менскім Загсам, кв. 29.

— Сяброўскі білет, выд. Слуцкім рабачкомам РЗЛ і асабовае пасьведчаньне, выд. Амгавіцкім сельсаветам на імя Клешчука В., кв. 63п.

— Вайсковая кніжка Шумко Н. А., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 64п.

— Вэксальны бляк на суму 100 руб. Анушкевіча Г. О., кв. 66п.

— Вучотна-вайсковы білет № 2416 Ляўкоўскага А. І., кв. 59п.

— Вайсковая кніжка № 1639 Хвастова А. М., кв. 60п.

— Конская карт. № 3584 Чышчэня Д. Р., выд. 4-м вайскова-конскім вучасткам Мазырск. акр., кв. 61п.

— Вучотна-конская карт. Касьцевіча В. М., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 14п.

— Пашпарт Падскробкі Ф. К., выд. Чэрвенскай міліц., кв. 15п.

— Дапрызыўная кніжка Слабодзіка М. А. нараджэ. 1905 г., выд. Мазырск. ваенкаматам, кв. 16п.

— Вайсковая кніжка № 1450 Духанёла І., выд. Лельчыцкім РВК, кв. 17п.

— Вайсковая кніжка Гайдукевіча Ц., выд. Шацкім с-с Пухавіцкага раёну. кв. 50п.

— Вучотна-вайсковая кніжка Таманушка Я., выд. у Клінцах, Бранскай губ. за № 3038 аб скончэньні вайсковай службы ў 37 арт. палку, кв. 52п.

— Вучотна-вайсковая карт. № 1192 Кузыменка І., выд Каралінскім РВК, кв. 54п.

— Мэтрычн. выпісь нараджэ. 1915 г. Чэрма Ц., выд. Мазырск. аддз. Загса, кв. 55п.

— Часова-конскае пасьведчаньне № 83 Дзятко В. І., выд. Раваніцкім сельсаветам, кв. 56п.

— Вучотна-конская карт. № 2301 Рамянова Ф